Пралетары ўсіх краёў, злучайцеся!

ЗЬВЯЗДА

Орган ЦК і Мен. Гаркому Камуністычнай партыі (б) Беларусі.

Год выданьня—XV. № 337 (4243). Нядзеля, 20 сьнежня 1931 г. МЕНСК, Савецкая 63

Сёньня ў нумары

«Перадавая—Вартавы рэвалюцыі (1 стар.).
КАНТРОЛЬНЫЯ ЛІЧБЫ НАРОДНАЙ ГАСПАДАРКІ БССР НА ЧАЦЬВЕРТЫ ГОД ПЯЦІГОДКІ—даклад старшыні СНК БССР тав. ГАЛАДЗЕДА на 2-й сэсіі ЦВК Х-га скліканьня (2-3 стар.).
Сёньня 14-я гадавіна ВЧК-ДПУ (1 стар.).
БІБЛІЯГРАФІЯ. І. ШМІДТ—Трацкісцкі кантрабандыст Валасэвіч у ролі гісторыка (3 стар.).
Сёньня апошні тэрмін выкананьня пляну здачы збожжа калгасным сэктарам (1 стар.).
Апошнія весткі з фронту індустрыялізацыі (3 стар.).
На юбілеі Андрэя Александровіча (4 стар.).
ПОЛЬШЧА.
Апарат сьмерці «дзейнічае» (4 стар.).
КІТАЙ.
Французскія войскі ўварваліся ў паўднёвы Кітай (4 стар.).

Вартавы рэвалюцыі

У 1917 годзе над былой «турмой народаў» узьвіўся сьцяг пралетарскай рэвалюцыі. Савецкая рэспубліка, народжаная ў агні кастрычніцкіх баёў, арганізуе абарону ад унутранай і сусьветнай рэакцыі.

Капітуляцыя Зімняга палацу была толькі пачаткам рашаючай барацьбы не на жыцьцё, а на сьмерць паміж пралетарскай дыктатурай і буржуазна-памешчыцкай контр-рэвалюцыяй. На барыкадах Кастрычніка яшчэ не змоўкла баявая кананада, як усе сілы старога сьвету — царскія генэралы і штабы імпэрыялістычных армій, чорнасоценцы і кадэты, меншавікі і эсэры — аб'ядналіся для барацьбы супроць Саветаў.

Сабатажам і шкодніцтвам, дывэрсіямі і забойствамі, шпіянажам і правакацыяй рэакцыя прабуе зруйнаваць Кастрычніцкую рэвалюцыю, падарваць і зьнішчыць пралетарскую дыктатуру. Ворагі рэвалюцыі арганізуюць змову за змовай. Шматлікія «Камітэты саюзу выратаваньня айчызны і волі», «Нацыянальныя цэнтры» і «Саюзы адраджэньня» рыхтуюць глебу для контр-рэвалюцыйнага перавароту. Замежныя пасольствы ператвараюцца ў гнёзды арганізатараў зьвяржэньня савецкай улады. Паны дыплёматы на чале з Локартам дапамагаюць ім і справай і рублём. Буржуазна-памешчыцкая зграя пускае ў ход індывідуальны тэрор. Рукамі эсэраў забіваюцца рэвалюцыйныя правадыры.

Бальшавіцкая партыя мабілізуе масы на абарону Кастрычніцкіх заваяваньняў. Партыя кідае лёзунг — **адстаяць і мацаваць пралетарскую дыктатуру.** Буржуазны тэрор партыя і пралетарыят паралізуюць рэвалюцыйным тэрорам.

На франтох грамадзянскай вайны Чырвоная армія гераічна адбівае націск інтэрвэнтаў і белагвардзейцаў. У тыле і на фронце — **НА ВАРЦЕ чырвонай рэвалюцыі, меч пралетарскай дыктатуры — ВЧК.** Гэты меч наносіць удары па ворагах **«трапна і без промаху»** (Сталін). У самыя цяжкія мінуты ВЧК, арганізаваная па ініцыятыве Леніна—заўсёды на сваім нязьменным пасту. Адна за адной ліквідуюцца антысавецкія змовы, прадыктаваныя з Парыжу, Лёндану і Варшавы. Савецкі тыл ачышчаецца ад інтэрвэнцыяністкай і белагвардзейскай агентуры. Узброеная клясавай пільнасьцю пралетарскіх мас, бязьмежна адданыя рэвалюцыі органы **ВЧК-ДПУ—ЯЕ ВЕРНЫЯ ВАРТАВЫЯ.**

Краіна Саветаў гіганцкім напружаньнем волі і сіл разьбівае ланцугі інтэрвэнцыі, голаду і блёкады. Пралетарыят пад кіраўніцтвам сваёй партыі перамагае. На франтох змаўкаюць гарматы. Пачынаецца ўпартая і гераічная будоўля. Рэспубліка залечвае раны, нанесеныя голадам і інтэрвэнцыяй. Адбудоўваюцца заводы і фабрыкі. Вырастаюць карпусы будучых індустрыяльных гігантаў.

Сацыялісты яго вялікасьці капіталу тым ня менш з дня на дзень прадракаюць «пагібель саветаў». У дні Кастрычніцкай рэвалюцыі меншавікі, не шкадуючы сіл, даводзяць хуткае і немінучае банкруцтва «гэтага бланкісцкага путчу». Цяпер рускія меншавікі задаюць першы тон у антысавецкім канцэрце буржуазнай і сацыял-фашысцкай прэсы. НЭП акрыляе надзеі міжнароднага меншавізму і буржуазіі. Бярэцца стаўка на шляхах «перараджэньне бальшавікоў». Першыя перамогі пралетарскай дзяржавы, заваяваныя на гаспадарчым фронце, выклікаюць сур'ёзную трывогу ў генэральных штабах.

Імпэрыялістычныя драпежнікі пачынаюць думаць і аб новай інтэрвэнцыі. Іх агентура ў нашай краіне, у асобе рэакцыйных буржуазных спэцыялістаў, па дырэктывах з Парыжу прабуе шкодніцтвам падарваць адноўленьне народнай гаспадаркі. Клясавая пільнасьць пралетарыяту выкрыла контр-рэвалюцыйную дзейнасьць шкоднікаў у Данбасе і іншых галінах гаспадаркі. На галовы шкоднікаў з усёй сілай зваліўся востры меч пралетарскай дыктатуры: ДПУ ліквідуе першыя шкодніцкія арганізацыі.

«Пагібель саветаў» буржуазным і сацыял-фашысцкім пісакам прышлося адкладваць з месяца на месяц, з году на год. Бальшавікі, аказваецца, зусім ня былі намераны «перараджацца». Краіна пралетарскай дыктатуры **пераможна завяршыла аднаўленчы пэрыяд.** На аснове індустрыялізацыі — гэтай «адзінай базы сацыялізму» (Ленін)—партыя разгарнула сацыялістычнае наступленьне па ўсім фронце.

Бальшавіцкая пяцігодка, загадзя асуджаная на няўдачу буржуазным і сацыял-фашысцкім друкам, як чарговы «камуністычны экспэрымэнт», **ЯЎНА ПЕРАМАГАЛА.** Партыя зьмяла са сваёй дарогі правых штрэйкбрэхэраў і іх «левых саюзьнікаў» і разграміла трацкізм—перадавы атрад контр-рэвалюцыі. План першых двух год пяцігодкі быў з посьпехам **ВЫКАНАН.** Асноўныя масы сялянства рашуча і беспаваротна павярнулі на шлях сацыялізму — шлях суцэльнай калектывізацыі. На яе аснове партыя перайшла да практычнага ажыцьцяўленьня лёзунгу ліквідацыі кулацтва як клясы — гэтай апошняй апоры міжнароднай контр-рэвалюцыі ў нашай краіне.

Перамогі пяцігодкі выбівалі грунт з-пад ног інтэрвэнтаў, разьбівалі іх надзеі на «перараджэньне бальшавізму», на рэстаўрацыю капіталізму ў СССР. Гераічныя насьмешкі па адрасе пяцігодкі замяніліся шалёнымі спробамі сусьветнай буржуазіі і яе агентаў сарваць план вялікіх работ. Машына інтэрвэнцыі зноў запрацавала поўным ходам. Лёкаі французскага імпэрыялізму і польскага фашызму — Рамзіны і Шэры, Громаны і Суханавы, Лёзікі і Ластоўскія добрасумленна выконвалі сваю ролю арганізатараў інтэрвэнцыі.

Працэсы «прампартыі» і «саюзнага бюро» ЦК РСДРП(м) з усёй сілай выкрылі патаемныя спружыны падрыхтоўкі новай антысавецкай вайны. І «прампартыя», і кулацка-эсэраўская «ТКП» і «саюзнае бюро» меншавікоў-шкоднікаў, і беларуская контр-рэвалюцыя — нацыянал-дэмакраты, гэтыя нацыянал-фашысты, па камандзе з Парыжу і Варшавы імкнуліся шкодніцтвам, здрадай і шпіянажам пракласьці мост для інтэрвэнцыі, ператварыць нашу краіну ў калёнію сусьветнага імпэрыялізму.

Партыя і пралетарыят выкрылі крывавыя пляны інтэрвэнцыяністаў. Вартавы рэвалюцыі — ДПУ папярэдзіў ажыцьцяўленьне іх праграмы. Меч пралетарскай дыктатуры, як і раней, нанёс удары па ворагах **«трапна і без промаху».** ДПУ пільна стаяла на сваім слаўным пасту. Гэтыя шкоднікі і іх гаспадары **ПРАЛІЧЫЛІСЯ.**

Савецкі Саюз уступіў у пэрыяд сацыялізму. Краіна Саветаў з посьпехам завяршае пабудову фундаманту сацыялістычнай экономікі. Пад кіраўніцтвам ленінскага ЦК наша партыя ўжо вырашыла пытаньне «хто-каго» і ў прамысловасьці і ў сельскай гаспадарцы на карысьць сацыялізму.

У суадносінах клясавых сіл у нашай краіне адбыліся найвялікшыя гістарычныя зрухі. Калгаснае сялянства стала цяпер цэнтральнай фігурай земляробства. Рашаючае месца ў сельска-гаспадарчай экономіцы заваяваў сацыялістычны сэктар — саўгасы і калгасы. Цяпер цэнтральнай задачай усяго калгаснага будаўніцтва зьяўляецца арганізацыйна-гаспадарчае умацаваньне калгасаў.

У дзень 14-й гадавіны існаваньня ВЧК-ДПУ мільённыя масы пралетараў з гарачай надзеяй адзначаюць вялікія заслугі свайго вартавога. У гэты-ж дзень сусьветная буржуазія пашле новыя сотні сьмяротных праклёнаў па адрасе ДПУ. Сацыял-фашысцкі і фашысцкі друк у гэты дзень папсуе ня мала паперы, «выкрываючы чарговыя жахі ЧК». Сваімі праклёнамі і «выкрыцьцямі» буржуазія толькі лішні раз пацьвердзіць, што ДПУ — сапраўды стойкі і верны вартавы рэвалюцыі, граза інтэрвэнтаў і шкоднікаў.

Сусьветны эканамічны крызіс з кожным днём усё мацней і мацней сьціскае за горла капіталізм. Гіганцкую прамысловую дэпрэсію, ахапіўшую ўсю капіталістычную гаспадарку, дапоўнілі аграрны, валютны і крэдытны крызісы. Эканамічны крызіс паглыбляецца з дня на дзень. Супярэчнасьці паміж імпэрыялістамі абвастраюцца да найвышэйшага пункту. Выхад з тупіка сусьветная буржуазія шукае ў новай вайне.

Акупацыя Маньчжурыі — прэлюдыя да новай бойні.

Пралетарыят Савецкага Саюзу — напагатове. Шалёныя спробы міжнароднага імпэрыялізму справакаваць СССР на вайну **НЕ АПРАЎДАЮЦЬ** надзей арганізатараў інтэрвэнцыі. СССР цьвёрда і няўхільна праводзіў і праводзіць палітыку міру. Імпэрыялістычныя шакалы ляскаюць зубамі і грымяць зброяй. Пралетарыят Савецкага Саюзу напамінае падпальшчыкам вайны, што пры першай спробе напасьці на краіну Саветаў яны паламаюць свае зубы.

На варце межаў рэспублікі Саветаў стаіць слаўная Чырвоная армія. Наша задача — **З НЕАСЛАБНАЙ ЭНЭРГІЯЙ ЯШЧЭ БОЛЬШ УЗМАЦНЯЦЬ АБАРОНАЗДОЛЬНАСЬЦЬ БАЦЬКАЎШЧЫНЫ МІЖНАРОДНАГА ПРАЛЕТАРЫЯТУ.**

У дзень 14-й гадавіны ВЧК-ДПУ—бальшавіцкае прывітаньне вернаму вартавому рэвалюцыі.

СЕНЬНЯ 14-я ГАДАВІНА ВЧК-ДПУ

БАЛЬШАВІЦКАЕ ПРЫВІТАНЬНЕ СТОЙКАМУ ВАРТАВОМУ КАСТРЫЧНІЦКІХ ЗАВАЯВАНЬНЯЎ, НЕПАХІСНАМУ БАРАЦЬБІТУ СУПРОЦЬ КОНТР-РЭВАЛЮЦЫІ

Прывітаньне ЦК КП(б)Б

ЦЭНТРАЛЬНЫ КАМІТЭТ ШЛЕ ГАРАЧАЕ ПРЫВІТАНЬНЕ АДПУ. НЯХАЙ ЖЫВЕ АДПУ — КАРАЮЧЫ МЕЧ ПРАЛЕТАРСКАЙ ДЫКТАТУРЫ, ВЕРНЫ ВАРТАВЫ САВЕЦКАГА САЮЗУ, ЗМАГАР ЗА ДАЛЕЙШЫЯ ПЕРАМОГІ САЦЫЯЛІСТЫЧНАГА БУДАЎНІЦТВА!

ЦК КП(б)Б.

Надзейнаму вартавому Кастрычніка

Шчыра вітаю з чатырнаццатай гадавінай органаў ДПУ-ВЧК. Ваш юбілей—гэта красамоўная гісторыя слаўнай і гераічнай барацьбы рабочае клясы за ўмацаваньне пралетарскай дыктатуры, за сацыялістычную рэвалюцыю. Клясавая барацьба не скончана, яна абвастраецца. Посьпехі разгорнутага сацыялістычнага наступленьня па ўсім фронце выклікаюць яраснае супраціўленьне варожых клясаў, якія ўсялякімі спосабамі імкнуцца затармазіць ход слаўнай гісторыі пралетарскай барацьбы, імкнуцца ўзарваць будоўлю сацыялізму ў нашай краіне. Ім гэтага зрабіць дагэтуль не ўдавалася, у першую чаргу дзякуючы няўсыпнай пільнасьці лепшага атраду барацьбітоў за сацыялізм—органаў ДПУ. Ня ўдасца ім ажыцьцяўляць свае замыслы і надалей, бо партыя і савецкі ўрад упэўнены ў няўсыпнай пільнасьці і надзейнасьці часавога пралетарскай рэвалюцыі.

Ваша сьвята зьяўляецца сьвятам усёй пралетарскай дзяржавы, усіх працоўных мас, бо барацьба ваша ёсьць адна з важнейшых частак агульна-клясавай барацьбы пралетарыяту за будоўлю сацыялізму, за арганізацыю сацыялістычнага грамадзтва.

Вітаючы ўсіх працаўнікоў АДПУ-ВЧК з юбілеем 14-ай гадавіны, я выказваю ўпэўненасьць, што вы, пад кіраўніцтвам бальшавіцкай партыі, і надалей будзеце змагацца з вялікай энэргіяй за генэральную лінію нашай партыі, супроць усякіх адхіленьняў ад гэтай лініі і яе скажэньняў, за сацыялістычную рэканструкцыю народнай гаспадаркі, за камунізм.

Старшыня Савету Народных Камісараў БССР **М. ГАЛАДЗЕД.**

19-XII-31 г. гор. Менск.

ДПУ — вострая зброя дыктатуры пралетарыяту

Цэнтральны Выканаўчы Камітэт Беларусі ССР горача вітае таварышоў чырвонаармейцаў і каманднa-палітычны і апэрацыйны склад ЧК-АДПУ БССР з XIV-годзьдзем.

14 год існаваньня ЧК-АДПУ супадае са сканчэньнем 3-га рашаючага году пяцігодкі і завяршэньнем пабудовы фундаманту сацыялістычнай эканомікі.

За мінулыя 14 год ЧК-АДПУ, будучы баявой зброяй клясавага змаганьня пралетарыяту, з гонарам выконвала свае баявыя абавязкі, паказаўшы гераічныя прыклады барацьбы з клясавымі ворагамі сацыялістычнага будаўніцтва.

Выкананьне задач IV-га году пяцігодкі, разгорнутае сацыялістычнае наступленьне па ўсім фронце—выклікаюць далейшай бязьлітаснай барацьбы супроць клясавых ворагаў.

ЦВК БССР упэўнен, што ўсе чэкісты пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі будуць і надалей захоўваць свае бальшавіцкія традыцыі і выкананьне сваіх абавязкаў будуць лічыць «справай гонару, справай славы, справай адвагі і геройства».

Чырвоныя пагранічнікі і надалей будуць пільна ахоўваць межы Беларускай ССР.

Няхай жыве камуністычная партыя і яе кіраўнік тав. Сталін!

Няхай жывуць сталёвыя вартавыя заваяваньняў Кастрычніка—АДПУ!

Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР **ЧАРВЯКОЎ.**

Сакратар ЦВК БССР **ГІЛЯКЕВІЧ.**

Тав. Сталін аб ДПУ

5-га лістапада 1927 год, т. Сталіна наведала дэлегацыя ў складзе 80 працаўнікоў ад рабочых арганізацый Германіі, Францыі, Аўстрыі, Чэха-Славакіі, Паўднёвай Амэрыкі, Кітаю, Бэльгіі, Фінляндыі, Даніі і Эстоніі. Гутарка працягвалася 6 гадзін. Дэлегаты задалі т. Сталіну рад пытаньняў. Паміж іншым было задана наступнае пытаньне:

— **Судовыя правы ДПУ, разгляд спраў без сьведак, без абаронцаў, тайныя арышты. 3 прычыны таго, што гэтыя меры цяжка дапускаюцца французскай грамадзкай думкай, то было-б цікава ведаць іх угрунтаваньне. Ці мяркуецца іх зьмяненьне, або спыненьне?**

На гэтае пытаньне т. Сталін адказаў так:

«ДПУ, або ЧК ёсьць карны орган савецкай улады. Гэты орган больш ці менш аналёгічны Камітэту Грамадзкай Бясьпекі, створанаму ў часе Вялікай французскай рэвалюцыі. Ён карае, галоўным чынам, шпіёнаў, змоўшчыкаў, тэрарыстаў, бандытаў, спэкулянтаў, фальшывамонэтчыкаў. Ён зьяўляецца нечым накшталт ваенна-палітычнага трыбуналу, створанага для абароны інтарэсаў рэвалюцыі ад замахаў з боку контр-рэвалюцыйных буржуа і іх агентаў.

Гэты орган быў створан на другі дзень пасьля Кастрычніцкай рэвалюцыі, пасьля таго, як выкрыліся ўсякія тэрарыстычныя і шпіёнскія арганізацыі, якія фінансуюцца расійскімі і замежнымі капіталістамі. Гэты орган разьвіўся і ўмацаваўся пасьля раду тэрарыстычных актаў супроць дзеячоў Савецкай улады, пасьля забойства т. Урыцкага, члена Рэвалюцыйнага камітэту ў Ленінградзе (ён быў забіты эс-эрам), пасьля забойства т. Валадарскага, члена Рэвалюцыйнага камітэту ў Ленінградзе (ён быў таксама эс-эрам), пасьля замаху на жыцьцё Леніна (ён быў паранен членам партыі эс-эраў). Трэба прызнаць, што ДПУ наносіла тады ўдары ворагам рэвалюцыі трапна і без промаху. Між іншым, гэта якасьць захавалася за ёй і да гэтага часу. З тых пор ДПУ зьяўляецца гразой буржуазіі, пільным вартаўніком рэвалюцыі, агаленым мячом пралетарыяту.

Ня дзіўна таму, што буржуа ўсіх краін адчуваюць да ДПУ зьвярыную ненавісьць. Няма такіх лягенд, якіх-б ня выдумлялі пра ДПУ. Няма такога паклёпу якога-б не распаўсюджвалі пра ДПУ. А што гэта значыць? Гэта значыць, што ДПУ правільна абараняе інтарэсы рэвалюцыі. Заклятыя ворагі рэвалюцыі лаюць ДПУ — значыцца ДПУ дзейнічае правільна.

Ня так адносяцца да ДПУ рабочыя. Пахадзеце па рабочых раёнах і запытайцеся рабочых пра ДПУ. Вы ўбачыце, што яны адносяцца да яе з павагай. Чаму? Таму, што яны бачаць у ёй верную абарону рэвалюцыі.

Я разумею нянавісьць і недавер'е буржуа да ДПУ. Я разумею розных буржуазных падарожнікаў, якія, прыяжджаючы ў СССР перш за ўсё пытаюцца аб тым, ці жыве яшчэ ДПУ і ці не наступіў час для ліквідацыі ДПУ. Усё гэта зразумела і ня дзіўна. Але я адмаўляюся зразумець некаторых рабочых дэлегатаў, якія прыяжджаючы ў СССР, з трывогай пытаюць: ці багата контр-рэвалюцыянэраў пакарана ДПУ, ці будуць яшчэ караць розных тэрарыстаў і змоўшчыкаў супроць пралетарскай улады, ці не пара спыніць існаваньне ДПУ? Адкуль толькі бярэцца ў некаторых рабочых дэлегатаў гэта клапатлівасьць аб ворагах пралетарскай рэвалюцыі? Чым яе вытлумачыць? Як яе ўгрунтаваць?

Прапаведуюць максымальную мяккасьць, раяць зьнішчыць ДПУ... Ну, а ці можна ручацца, што пасьля зьнішчэньня ДПУ капіталісты ўсіх краін адмовяцца ад арганізацыі і фінансаваньня контр-рэвалюцыйных груп змоўшчыкаў, тэрарыстаў, падпальшчыкаў, узрыўшчыкаў? Разброіць рэвалюцыю, ня маючы ніякіх гарантый на тое, што ворагі рэвалюцыі будуць разброены — ну, хіба-ж гэта ня глупства, хіба гэта не злачынства супроць рабочай клясы? Не, таварышы, мы ня хочам паўтараць памылак парыскіх камунараў. Парыскія камунары былі занадта мяккія ў адносінах да вэрсальцаў, за што іх з поўным угрунтаваньнем лаяў у свой час Маркс. А за сваю мяккасьць яны паплаціліся тым, што калі Т'ер увайшоў у Парыж, дзесяткі тысяч рабочых былі расстраляны вэрсальцамі. Ці ня думаюць таварышы, што расійскія буржуа і памешчыкі менш крыважэрныя, чым вэрсальцы ва Францыі? Мы ведаем, ва ўсякім выпадку, як яны расправіліся з рабочымі, калі займалі Сібір, Украіну, Паўночны Каўказ у саюзе з францускімі і ангельскімі, японскімі і амэрыканскімі інтэрвэнцыяністамі.

Я гэтым зусім не хачу сказаць, што ўнутранае становішча краіны абавязвае нас мець карныя органы рэвалюцыі. З пункту гледжаньня ўнутранага становішча, стан рэвалюцыі да таго моцны і непахісны, што можна было-б абыйсьціся без ДПУ. Але справа ў тым, што ўнутраныя ворагі не зьяўляюцца ў нас ізаляванымі адзіночкамі. Справа ў тым, што яны зьвязаны тысячамі ніцей з капіталістамі ўсіх краін, якія падтрымліваюць іх усімі сіламі, усімі сродкамі. Мы — краіна, абкружаная капіталістычнымі дзяржавамі. Унутраныя ворагі нашай рэвалюцыі зьяўляюцца агентурай капіталістаў усіх краін. Капіталістычныя дзяржавы прадстаўляюць базу і тыл для ўнутраных ворагаў нашай рэвалюцыі. Ваюючы з унутранымі ворагамі, мы вядзем, значыцца, барацьбу з контр-рэвалюцыйнымі элемэнтамі ўсіх краін. Судзеце цяпер самі, ці можна абыйсьціся пры гэтых умовах без карных органаў накшталт ДПУ.

Не, таварышы, мы ня хочам паўтараць памылак парыскіх камунараў. ДПУ патрэбна рэвалюцыі і ДПУ будзе жыць у нас на страх ворагам пралетарыяту».

Першы чэкіст Фэлікс Дзяржынскі

Сёньня мінае 14 год ад пачатку існаваньня баявых органаў пралетарскай дыктатуры — ВЧК-АДПУ. Мінула 14 год бесьперапыннай барацьбы з контр-рэвалюцыяй за справу рабочай клясы.

У гераічнай барацьбе з ворагамі дыктатуры пралетарыяту наша партыя мела немала страт на франтох грамадзянскай вайны, у часе задушэньня ўнутраных вылазак контр-рэвалюцыі. Многія загінулі ад здрадніцкіх стрэлаў ворагаў.

Цяжэйшай стратай для справы сусьветнага пралетарыяту была сьмерць бальшавіка-ленінца, першага чэкіста — Фэлікса Эдмундавіча Дзяржынскага. Член Цэнтральнага Камітэту ленінскай партыі, нязьменны старшыня ВЧК-АДПУ ён памёр на баявым пасту. Дзяржынскі быў адданейшым, дысцыплінаваным, вытрыманейшым членам нашай партыі. Ён вёў бязьлітасную барацьбу супроць апартуністаў усіх адценьняў за лінію нашай партыі, за Цэнтральны Камітэт.

Дзяржынскі быў самым ненавісным для буржуазіі бальшавіком. І ня дзіва. Стоячы на чале органаў ВЧК-АДПУ, ён бязьлітасна расправаўся з ворагамі рэвалюцыі, з ворагамі рабочай клясы. Контр-рэвалюцыя адчувала на сваім целе глыбокія, сьмяротныя раны, якія накідаў на ёй меч пралетарскай дыктатуры.

Для Дзяржынскага рэвалюцыйная барацьба была арганічнай патрэбнасьцю змагацца з самаўладзтвам і капіталізмам за пралетарскую рэвалюцыю, за сацыялізм да канца. Гэтыя рысы, уласьцівыя Дзяржынскаму, як і ўсёй старой гвардыі бальшавікоў, забясьпечылі пралетарыяту выпрабаванае кіраўніцтва для зьнішчэньня капіталізму на адной шостай частцы сьвету і адкрыцьця новай эры ў гісторыі чалавецтва.

Дзяржынскі прайшоў гераічны шлях рэвалюцыянэра. Пачынаючы з 1896 г., ён актыўна вядзе барацьбу за справу пралетарыяту.

Ён зрабіўся пагрозай для царскага ўраду і рана зьвярнуў на сябе яго ўвагу.

На катарзе Дзяржынскі застаўся такім-жа цьвёрдым і непахісным, як і на волі.

«Я сасьпеў у турме — пісаў ён у 1908 г. у сваім дзёньніку — у муках адзіноцтва, у журбе па сьвету і жыцьці. І тым ня менш сумненьне ў справе рабочай клясы ніколі не зазірнула мне ў вочы. І цяпер, калі ў патоках крыві пахаваны нядаўнія надзеі, калі гэтыя надзеі ўкрыжаваны на слупох шыбеніц, калі шмат тысяч барацьбітоў за волю кінуты ў турмы ці сасланы ў сьнегавыя тундры Сібіры — я ганаруся. Я бачу тыя вялізарныя масы, якія ўжо ўзварушаны, якія расхісталі стары будынак, у асяродзішчы якіх рыхтуюцца новыя сілы для новай барацьбы. Я ганаруся тым, што я з імі, што я іх бачу, адчуваю, разумею і што я сам шмат выцярпеў разам з імі. Тут, у турме, часта бывае дрэнна, бывае і страшна. І... тым ня менш, калі-б мне трэба было пачынаць зноў, я-б пачаў таксама. І не па абавязку. Для мяне гэта арганічная неабходнасьць».

Гэта было напісана ў гады самай чорнай рэакцыі, але і зараз гэтыя радкі нельга чытаць без унутранага хваляваньня.

У іх адбіваецца Дзяржынскі—«пралетарскі якабінец» такім, якім ён заставаўся да канца сваіх дзён.

Вызваліўшыся ў дні Лютаўскай рэвалюцыі з царскай катаргі Дзяржынскі з першых-жа дзён кідаецца ў падрыхтоўку Кастрычніцкага паўстаньня.

У дні грамадзянскай вайны, Фэлікс Эдмундавіч быў гразой ня толькі для ўнутраных, але і для сусьветных драпежнікаў.

Ён папярэдзіў многа нечаканых і небясьпечных для рэвалюцыі ўдараў. Гістарычная роля яго ў гэтай галіне вялізарна і надоўга застанецца ў розуме і сэрцы пакаленьняў вызваленага чалавецтва.

На адным з рашаючых паваротаў рэвалюцыі, пры пераходзе да рэканструкцыйнага пэрыяду, партыя паставіла Дзяржынскага на чале кіраўніцтва народнай гаспадаркай. Трэба было наладзіць будаўніцтва новых заводаў і фабрык, трэба было прыступіць да новага прамысловага будаўніцтва, каб, справіўшыся з гэтым, павесьці «разгорнутае наступленьне сацыялізму па ўсім фронце».

Партыя палічыла неабходным паставіць на гэту работу Фэлікса Дзяржынскага. І не памылілася. Ён увесь аддаўся новай рабоце. Ён быў на ёй таксама нястомным і бязьлітасным, як і ў гады грамадзянскай вайны. Ён павёў рашучую барацьбу з тэй расьцяпаннасьцю, разгільдзяйствам і ўсякага роду злоўжываньнямі, якія панавалі тады ў нашых гаспадарчых установах. На гэтай рабоце ён і «згарэў» — памёр ад паралічу сэрца зараз-жа пасьля адказнейшага выступленьня на пленуме Цэнтральнага Камітэту нашай партыі, у абарону ленінскай лініі партыі, супроць трацкістаў.

У дні 14-й гадавіны органаў ВЧК-АДПУ, калі ў выніку нашага пераможнага наступленьня па ўсіх франтох пабудовы сацыялізму, ворагі пралетарскай рэвалюцыі робяць «апошнія» спробы падняць галовы, калі заходняя буржуазія рыхтуе інтэрвэнцыю супроць Савецкага Саюзу, арганізуючы і накіроўваючы ўнутраную контр-рэвалюцыю—для кожнага сумленнага і адданага рабочай справе, кожнага, каму дорагі заваяваньні рэвалюцыі, хто з намі, а ня супроць нас — памяць аб лепшым бальшавіку Дзяржынскім, яго гісторыі, жыцьці і барацьбе ўздыме новыя сілы і шалёную энэргію на перамаганьне цяжкасьцяй, якія стаяць на шляху будаўніцтва сацыялізму.

Сьветлае і прыгожае жыцьцё, нястомная, кіпучая энэргія, непрымірымасьць да ўсяго, што шкодзіла будаўніцтву сацыялізму, самаахвярная адвага і адданасьць справе пралетарскай рэвалюцыі — павінны служыць узорам для шырокіх працоўных мас і новых пакаленьняў.

ДУНЕЛЬСКІ.

„Ні аднаго цэнтнэра збожжа—прыватніку“ (ЦК УсеКП(б)

Сёньня апошні тэрмін выкананьня пляну здачы збожжа калгасным сэктарам

20 сьнежня

Сёньня — апошні тэрмін, вызначаны ЦК КП(б)Б для поўнага выкананьня пляну здачы збожжа **калгасным сэктарам.**

Сотні перадавых калгасаў рапартуюць аб пасьпяховым і своечасовым ажыцьцяўленьні сваіх абавязкаў перад дзяржавай. Калгасы **Сіроцінскага, Глускага,** Вузьдзенскага і іншых раёнаў ня толькі выканалі, але і перавыканалі гадавыя заданьні.

Гэта дасягнута там, дзе раённыя арганізацыі, сельсаветы і парт'ячэйкі на мясцох па-бальшавіцку ацанілі важнасьць барацьбы за збожжа, зразумелі новую абстаноўку, у якой праходзіць збожжазагатоўчая кампанія гэтага году, новыя формы і мэтады клясавай барацьбы.

Аднак, такое становішча мы маем **далёка ня ўсюды.** У значнай частцы раёнаў калгасы недапушчальна **зацягваюць здачу збожжа** і, у радзе выпадкаў адстаюць нават ад індывідуальнага сэктару. На 15-га сьнежня ў сярэднім па рэспубліцы калгасны сэктар выканаў гадавое заданьне толькі на 80,1 проц.

Тлумачыцца гэта тым, што далёка ня ўсе парт'арганізацыі, ня ўсе сельсаветы і калгасныя органы зразумелі важнасьць масава-палітычнай работы ў калгасах і неабходнасьць **бязьлітаснай барацьбы з кулацка-рвацкімі тэндэнцыямі.**

Паведамленьні з паасобных калгасаў Случчыны і Койданаўшчыны, якія мы сёньня зьмяшчаем, сьведчаць, што іменна ў слабай масава-палітычнай рабоце, у адсутнасьці рашучай барацьбы з дробна-ўласьніцкімі тэндэнцыямі адсталых калгасьнікаў крыюцца прычыны зацяжкі здачы таварнай прадукцыі калгасамі.

Баявая задача ўсіх парт'арганізацый — неадкладна дабіцца максымальнага фарсаваньня збожжазагатовак у калгасным сэктары. Трэба ўзьняць **усю масу калгасьнікаў** на барацьбу за збожжа, ачысьціць калгасы ад кулацкіх элемэнтаў, рашуча ўдарыць па тых, з дазволу кажучы, «кіраўнікох», якія памятаюць толькі аб уласных рвацкіх патрэбах і зусім «забываюць» пра свае абавязкі перад пралетарскай дзяржавай.

У бліжэйшыя-ж дні калгасы павінны поўнасьцю ліквідаваць запазычанасьць па здачы збожжа.

У авангардзе загатовак

БЫХАЎ. Калгас **«ЧЫРВОНАЯ НІВА»,** на аснове шырокага разгортваньня масавай работы, рашучай барацьбы з дробнаўласьніцкімі тэндэнцыямі адсталых калгасьнікаў, дабіўся вялікай перамогі на загатоўчым фронце. План загатовак жыта, ячменю, аўса, грэчкі, бульбы і канапель выканан поўнасьцю.

Калгас таксама ідзе наперадзе і па мабілізацыі сродкаў. Заданьне па рэалізацыі акцый Трактарацэнтру па страхоўцы перавыканана.

Ян.

Рвацкія тэндэнцыі яшчэ не ліквідаваны

СЛУЦАК. Калгасны сэктар Случчыны недапушчальна зацягвае здачу збожжа дзяржаве. Гэта тлумачыцца тым, што ў радзе калгасаў усё яшчэ ня зжыты спажывецкія рвацкія тэндэнцыі, якія распальваюцца кулацтвам і яго агентурай. Вось некалькі фактаў.

Старшыня калгасу **«Чырвоная бяроза»** (Мялешкаўскага сельсавету), **ДАМАНСКІ,** падпаўшы пад кулацкі ўплыў, рашуча адмаўляецца ад выкананьня заданьня па збожжазагатоўках. Калгас за ўвесь час здаў усяго адну тону збожжа, замест 15 тон, вызначаных плянам.

— Няхай сельсавет шле, колькі хоча паперак, мы ўсё-роўна больш збожжа не дамо,—заяўляе Даманскі.

Старшыню падтрымліваюць і члены праўленьня **Масюк і Радзюк Ціхан,** якія таксама вядуць агітацыю супроць здачы збожжа дзяржаве.

Такія настроі пагладаюцца і ў паасобных калгасах **Шышчыцкага, Стараўскага, Палікарпаўскага сельсаветаў.**

Райкалгассаюз не вядзе рашучага змаганьня з апартуністамі зрыўшчыкамі збожжазагатовак. Масава-палітычная работа ў калгасах разгорнута слаба.

Пры вызначэньні плянаў збожжазагатовак калгасам, райкалгассаюз дапусьціў буйныя памылкі. Так, калгас імя Леніна атрымаў заданьне ад райкалгассаюзу на здачу (продаж) 24 тон збожжа; сельсавет гэтае заданьне зьнізіў да 20 тон, між тым, калгас, па кантрактацыйным дагавары павінен здаць 30 тон збожжа. Калгас **«Магутны»** павінен здаць, паводле заданьня райкалгассаюзу—3,8 тоны збожжа, а па кантрактацыі—8,2 тоны. Адпаведна калгас «Зьвязда»—3,8 тоны і 14 тон. Такім чынам, многія калгасы атрымалі яўна перапаменшаныя заданьні.

Трэба неадкладна выправіць дапушчаныя памылкі, шырока разгарнуць масава-палітычную работу сярод калгасьнікаў, арганізаваць іх на барацьбу з кулацка-спажывецкімі тэндэнцыямі. План здачы збожжа калгасамі можа і павінен быць поўнасьцю выкананы.

Самін.

Да другой канфэрэнцыі Менскай партарганізацыі

Аб'яднаны Пленум Менгаркому КП(б)Б і Гар. КК, які адбыўся 14-16 сьнежня г. г., абмеркаваў пытаньне аб скліканьні гарадзкой партканфэрэнцыі. Пленум пастанавіў СКЛІКАЦЬ ГАРАДЗКУЮ ПАРТЫЙНУЮ КАНФЭРЭНЦЫЮ 5-ГА СТУДЗЕНЯ 1932 ГОДУ.

Парадак дня канфэрэнцыі зацьверджан наступны:

1) Даклад ЦК КП(б)Б.
2) Даклад ЦКК КП(б)Б.
3) Справаздача гаркому КП(б)Б (дакл. тав. Кавальчук).
4) Справаздача ГарКК КП(б)Б (дакл. тав. Кеніг).
5) Справаздача рэвізійных камісіі ГК КП(б)Б (дакл. т. Раскін).
6) Народна-гаспадарчы плян на 1932 год (дакл. т. т. Валодзька і Каранеўскі).
7) Выбары кіруючых органаў гарадзкой партарганізацыі і дэлегатаў на 14-ы зьезд КП(б)Б.

Модус прадстаўніцтва на канфэрэнцыю ўстаноўлен наступны:

1 дэлегат з рашаючым голасам ад 20 членаў партыі і 1 дэлегат з дарадчым голасам ад 40 кандыдатаў партыі.

Ячэйкі, якія ня маюць паказанай колькасьці членаў партыі пасылаюць на канфэрэнцыю аднаго дэлегата з рашаючым голасам.

КАНТРОЛЬНЫЯ ЛІЧБЫ НАРОДНАЙ ГАСПАДАРКІ БССР НА ЧАЦЬВЕРТЫ ЗАКЛЮЧНЫ ГОД ПЯЦІГОДКІ

Даклад старшыні СНК БССР тав. ГАЛАДЗЕДА на II сэсіі ЦВК БССР Х-га скліканьня

I. Вынікі трэцяга рашаючага году пяцігодкі

Таварышы! Пад кіраўніцтвам нашай бальшавіцкай партыі, вядучы бязьлітасную барацьбу на два фронты — з правым і «левым» апартунізмам і з прымірэнцтвам да іх, рабочая кляса як усяго СССР, так і БССР, у 1931 годзе дабілася вялізарных посьпехаў у справе пабудовы сацыялізму у нашай краіне.

Пры выпрацоўцы народна-гаспадарчага пляну ў мінулым годзе мы, на аснове генэральнай лініі нашай партыі, вызначылі на 1931 год наступныя асноўныя задачы:

1. Далейшае павышэньне тэмпаў сацыялістычнага будаўніцтва;

2. Павышэньне вядучай ролі прамысловасьці ў разьвіцьці ўсёй народнай гаспадаркі БССР;

3. Замацаваньне дасягнутых да пачатку 1931 году посьпехаў калектывізацыі і далейшае разьвіцьцё калгаснага руху. На аснове суцэльнай калектывізацыі ажыцьцяўляць ліквідацыю кулацтва як клясы;

4. Рэканструкцыю і падцягваньне работы транспарту, паляпшэньне шляхоў зносін і інш.;

5. Культурную рэвалюцыю, павышэньне тэхнічных ведаў шырокіх працоўных мас, узмацненьне фронту навукі і ідэалёгічнага фронту ў бальшавіцкім духу;

6. Павышэньне матар'яльнага і культурнага ўзроўню рабочай клясы і ўсіх працоўных мас;

7. Узмацненьне кіруючай ролі пралетарыяту ва ўсім сацыялістычным будаўніцтве, далейшае разгорнутае сацыялістычнае наступленьне і ўзмацненьне клясавых пазыцый пралетарыяту. Гэта была важнейшая ўстаноўка народна-гаспадарчага пляну 1931 году.

З тых фактаў, якія я далей вам прывяду, відаць, што гэтыя важнейшыя канкрэтныя задачы, пастаўленыя перад плянам трэцяга году пяцігодкі, пачці ў асноўным выкананы з посьпехам, а па некаторых галінах і перавыкананы. Гэтага мы маглі дасягнуць таму, што пралетарыят СССР і БССР праявіў магутны размах творчай ініцыятывы, пабальшавіцку змагаўся і змагаецца за высокія і напружаныя тэмпы сацыялістычнай будоўлі. Увядзеньнем новых форм і мэтадаў працы на сацыялістычнай вытворчасьці (сацспаборніцтва, ударніцтва, «сквозные» гаспадарча-разрахунковыя брыгады і г. д.) рабочая кляса паказала сваё ўменьне працаваць па-новаму, па-бальшавіцку і праявіла ў шырокім маштабе сваю арганізатарскую здольнасьць.

1931 год прынёс нам новыя рашаючыя перамогі па ўсім разгорнутым фронце сацыялістычнага наступленьня. Ва ўсіх галінах пазыцыі сацыялізму пашыраюцца і з кожным днём узмацняюцца. Ленінскае пытаньне — «хто каго» канчаткова вырашаецца на карысьць сацыялізму, і 1931 год зьявіўся годам завяршэньня пабудовы фундаманту сацыялістычнай эканомікі.

Гэтая рашаючая перамога сацыялізму характарызуецца наступнымі фактамі:

1. Народны прыбытак па Саюзе ССР у 1931 годзе ў параўнаньні з 1930 годам значна вырас.

Характэрным зьяўляецца і тое, што ў агульным прыросьце народнага прыбытку ўсё большую ролю адыгрывае сацыялістычны сэктар, яго ўдзельная вага ў параўнаньні з мінулым годам значна ўзрасла.

Па БССР прырост народнага прыбытку ў 1931 годзе вызначаецца ў 13-14 проц., прычым удзельная вага сацыялістычнага сэктару ў народным прыбытку складае 75-80 проц. супроць 60 проц. у 1930 годзе.

2. Валавая прадукцыя прамысловасьці па БССР, якая плянуецца ВСНГ і Наркамснабам Саюзу значна вырасла, прычым найбольш шпаркім тэмпам ідзе рост цяжкай індустрыі, якая вырабляе сродкі вытворчасьці.

Па БССР валавая прадукцыя прамысловасьці, якая плянуецца ВСНГ і Наркамснабам БССР, вырасла на 69 проц. або да 673,2 млн. руб. супроць 376,7 млн руб. у 1930 годзе. Найбольш высокі прырост валавой прадукцыі паказвае саюзная прамысловасьць, якая знаходзіцца на тэрыторыі БССР і плянуецца ВСНГ СССР. Яе рост вызначыўся ў 96,9 проц. супроць 1930 году.

3. Капітальныя ўкладаньні 1931 году па СССР як у прамысловасьць, электрыфікацыю, будаўніцтва раённых электрычных станцый, так і ў транспарт і сельскую гаспадарку значна павялічыліся ў параўнаньні з 1930 годам.

Па БССР укладаньні ў прамысловасьць у 1931 годзе вырасьлі на 31,4 проц. і даведзены да 87 млн. руб. У нас таксама найбольшы прырост капітальных укладаньняў атрымала прамысловасьць групы «А», г. зн., больш буйная індустрыя.

Укладаньні ў транспарт вырасьлі на 34,3 проц. і даведзены да 90,2 млн. руб.

У сельскую гаспадарку БССР укладаньні вырасьлі на 59,3 проц., а ў абсалютнай лічбе ў 1931 годзе на 151 млн. руб. супроць 90 млн. руб., якія былі затрачаны ў 1930 годзе.

4. Выпрацоўка электраэнэргіі па БССР даведзена да 146 млн. клвт-гадзін супроць 69 млн. клвт-гадзін у 1930 годзе.

Гэта гаворыць аб энэргетычным узбраеньні нашай народнай гаспадаркі. Для БССР такі рост выпрацоўкі электраэнэргіі мае асабліва важнае значэньне, бо як усім нам вядома, тэхнічны і энэргетычны ўзровень народнай гаспадаркі БССР у ранейшыя гады быў даволі нізкі.

Рост індустрыі, павялічэньне аб'ёму прадукцыі прамысловасьці, значны прырост народнага даходу,—усё гэта дало магчымасьць пралетарыяту СССР узмацніць свае клясавыя пазыцыі і павысіць свой матар'яльны і культурны ўзровень, а таксама пашырыць і ўзмацніць кадры пралетарыяту.

Дазвольце прывесьці некалькі лічбаў з росту рабочай клясы і павышэньня яе матар'яльнага ўзроўню. Колькасьць рабочых і служачых па СССР у 1931 годзе павялічылася на 29,1 проц., прычым удзельная вага індустрыяльных рабочых да ўсіх работнікаў па найме павысілася ў 1931 годзе да 58,1 проц. супроць 55,5 проц. у 1930 годзе.

Па Савецкай Беларусі колькасьць рабочых і служачых у 1931 г. вырасла на 51,7 проц. і дасягнула 469 тыс. агульнай колькасьці супроць 375 тыс. у 1930 годзе. Удзельная вага індустрыяльных рабочых у БССР павысілася ў 1931 годзе да 45,7 проц. супроць 39,8 проц. у 1930 годзе.

Як 1931 год адбіўся на павышэньні матар'яльнага ўзроўню пралетарыяту.

Фонд зарплаты па СССР у 1931 годзе павялічыўся на 58,1 проц. Агульнасярэднягадовая зарплата ў 1931 годзе павялічылася амаль на 18 проц. Па БССР фонд зарплаты ўзрос на 53 проц. і дасягнуў у 1931 годзе 476 млн. руб. супроць 311 млн. руб. у 1930 годзе.

Агульнасярэдняя гадавая зарплата па БССР павялічылася на 22,3 проц., дасягнуўшы 1.014 руб., супроць 829 руб. у 1930 годзе. Па ўсёй цэнзавай прамысловасьці яна павялічылася з 973 руб. да 1.053 руб.

Як павялічыўся сярэднямесячны бюджэт рабочай сям'і? Па БССР мы маем наступныя лічбы: У 1929 г. сярэднямесячны бюджэт рабочай сям'і складаў 117,8 руб., у 1930 г.—139,27 руб., у 1931 г. за першае паўгодзьдзе гэты бюджэт рабочай сям'і павялічыўся да 157,5 руб. і дае прырост на 12,7 проц.

У другім паўгодзьдзі, паводле папярэдніх даных, прырост бюджэту рабочай сям'і расьце больш шпаркімі тэмпамі, чым у першым паўгодзьдзі

Удзельная вага рабочых у БССР значна павялічылася ў адносінах да ўсёй колькасьці насельніцтва. У 1930 г. яна складала 1,95 проц., а ў 1931 г.—3,2 проц., пры агульным росьце насельніцтва БССР на 2 проц.—з 5.264.234 чал. у 1930 г. да 5.370.567 чал. у 1931 г.

Гэта сьведчыць аб тым, што высокія тэмпы індустрыялізацыі ў нашай рэспубліцы забясьпечылі ўзмацненьне пралетарскай базы БССР. Для БССР гэта мае асаблівае значэньне таму, што ў мінулыя гады ў нас праслойка рабочай клясы сярод агульнага насельніцтва была вельмі слабая.

Прывяду вам яшчэ некаторыя вынікковыя лічбы 1931 г. па сельскай гаспадарцы БССР.

Валавая прадукцыя сельскай гаспадаркі БССР паводле папярэдніх падлікаў вырасла на 12,5 проц. Удзельная вага сацыялістычнага сэктару ў валавой прадукцыі павялічылася больш чым у 2 разы. Рост удзельнай вагі сацыялістычнага сэктару ў валавой прадукцыі сельскай гаспадаркі абумоўлен тымі нявымерна вялікімі посьпехамі, якія наша савецкая дзяржава мае ў справе калектывізацыі бядняцка-серадняцкіх гаспадарак і будаўніцтва саўгасаў.

1931 год зьявіўся пераломным годам у справе масавай калектывізацыі, тым самым у справе карэннай сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі на калгасны лад і вельмі знамянальным годам, як для ўсяго СССР, так і для БССР.

На 10 сьнежня ўзровень калектывізацыі дасягае 50,5 проц. Па СССР-жа калектывізавана 62,2 проц. бядняцка-серадняцкіх гаспадарак. Гэта гаворыць пра тое, што рабочая кляса пад кіраўніцтвам сваёй партыі, узмацняючы тэмпы індустрыялізацыі краіны, адначасова на базе індустрыялізацыі СССР, здолела грунтоўна павярнуць серадняка ў бок сацыялізму і зрабіць яго актыўным удзельнікам сацыялістычнага будаўніцтва.

Такі прырост калгаснага будаўніцтва накладае свой адбітак на ўсе вытворчыя працэсы сельскай гаспадаркі, рэарганізуючы яе карэнным чынам на новай тэхнічнай і сацыяльнай базе.

Мы ўжо маем у калгасах БССР аграмаджаньне буйной рагатай жывёлы больш, чым на 23 проц. Асноўныя-ж сродкі вытворчасьці (цяглавая сіла, с. г. інвэнтар і інш.) аграмаджаны амаль што цалкам. На зьдзельшчыну пераведзена 86,8 усіх калгасаў, ураджай разьмеркаван у 80 проц. калгасаў. Трэба адзначыць, што ў гэтай галіне нашы калгасныя органы крыху адсталі, бо тэрмін поўнага разьмеркаваньня ўраджаю па прынцыпе колькасьці і якасьці затрачанай калгасьнікамі працы ўжо канчаецца. Нашым калгасным органам прыдзецца ўзмацніць сваю работу, каб у бліжэйшы-ж час цалкам скончыць разьмеркаваньне ўраджаю.

Вельмі важным зьяўляецца той факт, што на нашых калгасных таварных фэрмах, у саўгасах і ў гаспадарках спажывецкай кааперацыі мы ўжо змаглі сканцэнтраваць да 25 проц. буйной рагатай жывёлы ўсяго пагалоўя па БССР. А калі ўлічыць і кароў самых калгасьнікаў спэцыялізаваных калгасаў, то атрымаецца, што 48,2 проц. кароў знаходзіцца ў саўгасах, калгасных таварных фэрмах і ў калгасьнікаў. Гэта мае вялікае народна-гаспадарчае і палітычнае значэньне.

Удзельная вага сьвіней саўгасаў, калгасаў, калгасных таварных фэрм і спажывецкай кааперацыі складае 32 проц. усяго пагалоўя сьвіней у БССР.

У сувязі з ростам калгасаў у 1931 г. значна павялічылася таварнасьць сельскай гаспадаркі БССР. Ужо ў гэтым годзе мы маем значна вышэйшы ўраджай на калгасных палёх, чым у аднаасобным сэктары. Гэта наглядна паказвае ўсяму сялянству, якое яшчэ не ўвайшло ў калгасы, сапраўдную выгоднасьць калгаснага земляробства.

Адначасова трэба адзначыць, што мы ў гэтым годзе сельскую гаспадарку БССР і, у першую чаргу і пераважна калгасы, забясьпечылі вялікай колькасьцю трактароў і сельска-гаспадарчых машын. Усяго трактароў завезена ў 1931 г. у БССР—13.000 HP, сельска-гаспадарчых машын—на суму каля 13 млн. руб.

Пасеўную плошчу ў 1931 г. мы пашырылі на 5,5 проц.

Лічбы, якія я вам прачытаў, паказваюць, што пралетарыят БССР мае значныя дасягненьні і ў галіне сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі, павышэньня яе вытворчасьці, пашырэньня і ўзмацненьня абагуленага сацыялістычнага сэктару сельскай гаспадаркі.

Якія вынікі мы маем у 1931 г. у справе культурнага будаўніцтва БССР?

Аб гэтым гавораць наступныя лічбы. Лік вучняў у першым канцэнтры ў 1931 г. даведзен да 658.400 чал., у другім канцэнтры—да 109.000 чал. Па ліквідацыі непісьменнасьці лік асоб, якія навучаюцца ў школах пісьменнасьці, складае 478 тыс. чал., у школах па ліквідацыі напісьменнасьці—150 тыс. чал.

У 1931 г. нам удалося давесьці сетку ВТНУ і ВНУ да 26 адзінак. Апрача таго, саюзныя арганізацыі на тэрыторыі БССР адкрылі 4 ВНУ. Ва ўсіх гэтых ВНУ навучаецца 10,5 тыс. чал.

Лік тэхнікумаў даведзен да 88 адзінак, у якіх навучаецца 22.392 чал. У 1931 г. нам удалося зрабіць выпуск па ВТНУ і ВНУ—675 чал., па тэхнікумах—1.853 чал.

Мы таксама маем значныя дасягненьні ў падрыхтоўцы кваліфікаванай рабочай сілы. Лік ФЗВ і аналёгічных школ вызначаецца ў 75 адзінак. У іх навучаецца 19.219 чал.

У галіне культуры трэба адзначыць яшчэ і такі факт, як пашырэньне кінафікацыі БССР. Гарадзкая кінасетка даведзена да 231 адзінкі, а сельская—да 639 адзінак з дзеннай прапускной здольнасьцю—у гарадох 15.430 чал., у вёсцы—10.800 чал.

Значныя дасягненьні ёсьць у выдавецкай справе. Гадавы тыраж цэнтральных газэт павялічыўся на 34,5 проц. і дасягае 65.096 тыс. экз. Гадавы тыраж раённых газэт павялічыўся ў 1931 годзе на 331,5 проц., па часопісах ён дасягае 2.576 экз. Кніжнай прадукцыі выдана 103.563 тыс. друкаваных аркушаў.

Дасягненьні на культурным фронце вымяраюцца ня толькі прыростам матар'яльнай базы. Яны яшчэ характарызуюцца тым, што ў 1931 г. мы маем значныя дасягненьні ва ўзмацненьні ідэалёгічнага фронту. Якасьць выдавецкай прадукцыі значна палепшылася з боку ідэалёгічнай вытрыманасьці, якую і надалей трэба ўсё больш павышаць.

Барацьба з кулацтвам і яго ліквідацыя як клясы, яго шалёнае супраціўленьне нашым мерапрыемствам па сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі, праяўленьне шкодніцтва на многіх вучастках сацыялістычнага будаўніцтва—мелі свой адбітак на культурным і ідэалёгічным фронце. На гэтым вучастку дзейнічалі нацыянал-дэмакраты. Гэтыя ідэолёгі кулака, гэта агентура Кандрацьцевых, Громанавых і інш. інтэрвэнтаў імкнулася зьвіць сабе гняздо ня толькі ў эканамічных органах, але і ў культурных установах. Аб гэтым ужо ўсім вядома. Наша партыя і савецкая ўлада нанесла руйнуючы ўдар клясава-варожым інтэрвэнцкім элемэнтам, нацыянал-дэмакратызму. Нам удалося выкрыць іх нутро, іх тактыку і стратэгію, вывесьці ўсё гэта наверх, разьвянчаць іх перад шырокімі масамі. Агентура замежных інтэрвэнтаў—нацыянал-дэмакраты, як і Рамзіны з Кандрацьцевымі і Громанамі, аказалася бітай як па ўсім Савецкім Саюзе, так і ў БССР, на ўсіх вучастках разгорнутага сацыялістычнага фронту, у тым ліку і на ідэалёгічным фронце.

Узмацненьне ідэалёгічнага фронту мае асабліва важнае значэньне. Праўда, тут нам прадстаіць яшчэ вельмі многа работы. Далейшая барацьба за чыстату марксыцка - ленінскай тэорыі павінна весьціся і далей з неаслабнымі тэмпамі. Тут мы павінны на справе і бязьлітасна змагацца з усякімі ўхіламі і скажэньнямі марксыцка-ленінскай тэорыі і ўсялякімі буржуазна-лібэральнымі адносінамі да гэтых скажэньняў.

Барацьба на два фронты ў галіне нацыянальнай культуры, як з вялікадзяржаўным шавінізмам, гэтай галоўнай небясьпекай на даным этапе, так і з ухіламі ў бок мясцовага нацыяналізму, і барацьба з прымірэнцтвам да іх — зьяўляюцца і надалей галоўнай задачай усяго пралетарыяту, усіх працоўных мас, савецкіх і партыйных арганізацый.

Немалыя дасягненьні і ў справе аховы здароўя. Яны, у першую чаргу, выяўляюцца ў тым, што нам у 1931 г. удалося павялічыць колькасьць ложкаў у больніцах на 17,4 проц. і самае галоўнае,—арганізаваць і павялічыць колькасьць мэдычных пунктаў на прамысловых прадпрыемствах — на 81,4 проц., з якіх для сэзонных рабочых арганізаваны 100 пунктаў, на торфараспрацоўках —14, у саўгасах — 64 і ў калгасах 100. Гэта мае вялікае палітычнае значэньне. Гэтым самым мы наблізілі мэдыцыну да абслугоўваньня асноўных пралетарскіх кадраў. Выдаткі на арганізацыю аховы здароўя павялічылася ў 1931 г. на 52,3 проц. супроць 1930 г.

Як бачыце нашы дасягненьні ў трэцім рашаючым годзе пяцігодкі вялікія. Працоўныя БССР гэтымі дасягненьнямі абавязаны правільнай ленінскай нацыянальнай палітыцы, той неаслабнай і штодзеннай увазе, якая праяўляецца з боку пралетарыяту ўсяго Савецкага Саюзу, з боку партыі і ўраду СССР да падцягваньня матар'яльнай і культурнай базы нацыянальных, у мінулым адсталых рэспублік.

II. Далейшае паглыбленьне эканамічнага крызісу у капіталістычных краінах

Паказаныя посьпехі асабліва выпукляюцца на фоне эканамічнага крызісу капіталістычных краін.

Якія працэсы адбываюцца ў краінах капіталізму?

На XVI зьезьдзе УсеКП(б) тав. Сталін, аналізуючы міжнароднае эканамічнае становішча адзначыў, што крызіс капіталістычных краін атрымае сваё далейшае і бурнае разьвіцьцё. Гэтыя словы тав. Сталіна цалкам і поўнасьцю апраўдаліся. І сапраўды, за час ад XVI партыйнага зьезду мы наглядаем нябачанае пашырэньне і паглыбленьне міжнароднага крызісу.

Калі ўзяць Амэрыку — гэтую самую магутную ў мінулым дзяржаву ў эканамічных і тэхнічных адносінах, дык аказваецца, што за 10 мес. 1931 г. лік збанкрутаваўшых фірм дайшоў да 23.332. Дэфіцыт гэтых фірм за 10 мес. 1930 г. склаў 529 млн. даляраў, а за 10 мес. 1931 г. ён вырас да 602.4 млн. даляраў. Колькасьць банкаў, спыніўшых плацяжы складае 1.753. Выплаўка чыгуну (калі яе ўзяць у параўнаньні з 1929-30 г.) у 1931 г. складае толькі 45 проц. а выраб сталі ўсяго 33 проц. За апошні час выдаюцца спэцыяльныя законы аб скарачэньні плошчы пасеваў баваўны на 50 проц. Зарплата рабочых бязупынна зьніжаецца, прычым цяпер яна зьнізілася да 30 проц. Беспрацоўных у Амэрыцы налічваецца больш чым 12 млн. чал.

Цікавым зьяўляецца такі факт: урад Бразіліі пастанавіў зьнішчыць (паліць) 45 млн. пудоў кавы, якіх—хапіла-б для задавальненьня 75 проц. гадавой патрэбнасьці ўсяго сьвету.

Чаму яны топяць здабытую рабочымі рукамі прадукцыю ў моры? Таму што ў іх — капіталістаў пры наяўнасьці крызісу перавытворчасьці праходзіць адначасова нячуванае зьбядненьне рабочай клясы і ўсіх працоўных мас і гэтым самым пакупная здольнасьць сялян і рабочых, як масавых спажыўцоў, значна зьнізілася. У іх больш 12 млн. беспрацоўных, якія ня маюць сродкаў для пражыцьця і капіталісты ня могуць рэалізаваць сваю прадукцыю па выгодных для сябе цэнах. Значыць, яны становяцца на шлях зьнішчэньня прадукцыі і тым самым думаюць утрымаць высокія цэны.

Многім з вас вядома, што ў мінулым годзе ўзрастаючы эканамічны крызіс капіталістычных дзяржаў менш за ўсё закрануў Францыю. Яна, дзякуючы падскурнаму ўпырскваньню нямецкага золата, якое атрымлівала ў выглядзе рэпарацыйных плацяжоў па Версальскім дагаворы пасьля імпэрыялістычнай бойкі, да апошняга часу яшчэ трымалася, і крызіс яе менш закрануў, чым іншыя капіталістычныя краіны.

Што-ж мы маем ва Францыі ў 1931 г.? Аказваецца, што крызіс капіталізму ўцягнуў у сваю арбіту і яе. Яна шпаркімі тэмпамі коціцца па шляху эканамічнага крызісу. Гэта відаць з наступных фактаў. Сярэдне-месячная здабыча вугалю значна зьнізілася. Здабыча жалезнай руды зьменшылася на 25 проц., выплаўка чыгуну — на 23 проц., выраб сталі—на 16 проц. Мэталяапрацоўчая прамысловасьць загружана толькі на 60 проц. Аўтамабільная прамысловасьць — усяго на 40 проц. Пасыўнасьць гандлёвага балянсу за 10 месяцаў складае 10 млр. франкаў. Увоз прамысловага сырцу зьнізіўся на 23 проц., а вываз прамысловых вырабаў скараціўся на 28 проц.

У кастрычніку 1930 г. працавала 139 доменных печаў, а ў кастрычніку 1931 г. — толькі 103.

Беспрацоўных, нават паводле іх афіцыяльных даных, налічваецца больш 1 млн. чал., а вы ведаеце, што іх афіцыяльныя даныя не адбіваюць фактычнага становішча рэчаў. Працуючых ня поўны тыдзень — 4 млн. чал. Прычым характэрна, што дапамогу па беспрацоўі атрымліваюць толькі 70 тыс. чал. з аднаго мільёну беспрацоўных.

Індэкс курсаў акцый французскіх банкаў і прадпрыемстваў за апошнія 10 месяцаў зьнізіўся з 473 да 249.

Найбольш яркім выразам хісткасьці фінансаў ва Францыі ў гэтым годзе можа служыць такі фактар, як скарачэньне ўкладаў у банкі з боку дробнай буржуазіі гораду і вёскі і французскага рант'е. Французская вёска і дробная гарадзкая буржуазія, пачуўшы гэту крызісную кан'юнктуру, схавалі ў скрыначках каля 20 млрд. франкаў, зьменшыўшы на гэту суму ўклады ў банкі.

Бюджэт зводзіцца з дэфіцытам у суме да 6 млрд. франкаў.

Вось вам малюнак эканамічнай і фінансавай няўстойлівасьці Францыі.

Англія, як вы ведаеце, таксама была адной з магутных эканамічных дзяржаў да імпэрыялістычнай вайны. А што робіцца ў ёй зараз? Сярэдняя месячная выпрацоўка сталі ў 1913 г. раўнялася 639 тыс. тон, у 1929 г. — 803 тыс. тон, у 1930 г. — 680 тыс. тон, а ў 1931 г. — 426 тыс. тон.

Выплаўка чыгуна раўнялася ў 1913 г. —855 тыс. тон, у 1930 г.—516 тыс. тон і толькі 316 тыс. тон у 1931 г. Прычым, калі ўзяць выплаўку чыгуна па месяцох 1931 г., дык яна з месяца ў месяц зьніжаецца. З 394 доменных печаў у канцы верасьня 1931 г. працавала толькі 62. Зьнізіўся значна і экспарт Англіі. Напрыклад, за 9 месяцаў 1929 г. экспарт вугалю раўняўся 44 млн. тон, а за 9 месяцаў 1931 г. ён раўняецца 31 млн. тон.

Колькасьць беспрацоўных у Англіі даходзіць да 3 млн. чал. Як вам вядома, у Англіі ануляваны залаты стандарт. Гэта сьведчыць аб няўстойлівасьці фінансаў. Апрача гэтага, курс фунта стэрлінгаў упаў на 30 проц. ніжэй парытэту. Як ужо вядома, у Англіі ўведзена палітыка пратэкцыянізму.

А што-ж робіцца ў Германіі? Як вам вядома, пятля эканамічнага крызісу Германіі ўсё тужэй зацягваецца на шыі нямецкага капіталізму. Для ілюстраваньня гэтага прывяду толькі некалькі лічбаў.

Калі ўзяць верасень месяц, дык дзенная выплаўка чыгуна ў 1929 г. раўнялася 37 тыс. тон, у 1930 г. дзенная выплаўка ў адпаведным месяцы раўнялася ўжо 21,7 тыс. тон, а ў 1931 г. — 14,6 тыс. тон.

Дзенная выплаўка сталі адпаведна па галох у верасьні раўнялася: 1929 г. — 49,4 тыс. тон, 1930 г. — 31,3 тыс. тон, а ў 1931 г. — 28,8 тыс. тон.

Дзенная здабыча вугалю ў Рурскім басэйне ў 1929 г.—408,5 тыс. тон, у 1930 г.—331,2 тыс. тон, у 1931 г.—268,7 тыс. тон.

Колькасьць беспрацоўных, зарэгістраваных паводле іх афіцыяльных даных у ліпені 1930 г., значылася ў 2.690 тыс. чал., а ў кастрычніку 1931 г. ужо значыцца 4.600 тыс. чал.

Цікава адзначыць і наступны факт. Газэта «Фінанспалітышэ карэспандэнт» вылічвае агульныя страты працоўнага даходу рабочай клясы Германіі за перыяд з ліпеня 1929 г. па верасень 1931 г. у 13 млрд. марак. Проста кажучы, гэта азначае, што рабочая кляса Германіі за 2 гады страціла сваіх працоўных даходаў на вышэй паказаную суму.

Дзе-ж дзеліся гэтыя сродкі рабочых? Аб гэтым гаворыць наступны факт. Праф. Дзесацэр у часопісе «Дэйчэ форкорбірт» дае лічбу а бтым, што пратэкцыяністкая палітыка Брунінга дала магчымасьць буйным аграрыям Усходняй Прусіі атрымаць з рук ураду звыш 4 млрд. марак. Гэта атрымалі толькі буйныя аграрыі аднэй Усходняй Прусіі, а колькі-ж атрымалі памешчыкі ўсёй Германіі?

Як бачыце, фашысцкая палітыка нямецкага ўраду перакачвае сродкі пралетарыяту ў кішэні памешчыкаў і капіталістаў.

Як стаіць справа з эканомікай Польшчы? З матар'ялаў друку ўсім вядома, што год таму назад ў Польшчы адбываўся вялікі, больш востры, чым у іншых капіталістычных дзяржавах эканамічны крызіс.

Як-жа стаіць справа ў 1931 г.? Можа за гэты час справа палепшылася? Аказваецца, паводле афіцыяльных даных, якія асьвятляюцца ў польскіх газэтах і эканамічных часопісах, гэта справа не палепшылася, ды яна і ня можа палепшыцца. Эканамічнае становішча Польшчы зьяўляецца адным з найбольш цяжкіх дзякуючы таму, што Польшча ў эканамічных, фінансавых ды і палітычных адносінах амаль цалкам знаходзіцца ў залежнасьці ад іншых капіталістычных дзяржаў. А наколькі іншыя капіталістычныя дзяржавы коцяцца па шляху далейшага эканамічнага крызісу, пастолькі гэты крызіс цягне за сабою і гаспадарку Польшчы, да і ня можа не цягнуць.

На прыводзячы агульных паказальнікаў эканамічнага становішча Польшчы, я прывяду толькі некаторыя факты. Прычым гэтыя факты ўзяты выключна з польскіх газэт і афіцыяльнай літаратуры. Напрыклад: колькасьць беспрацоўных перавышае 1.100 т. чал. 33% усіх абсьледаваных сялянскіх гаспадарак атрымліваюць прыватную пазыку па 48 проц. гадавых, а ў Заходняй Украіне працэнт, які бярэцца за прыватную пазыку з селяніна, дасягае 287 проц. у год.

Даныя аб становішчы польскай мэталюргіі сьведчаць аб рэзкім абвастрэньні крызісу. Напрыклад: у 1913 г. сярэдня-месячная здабыча чыгуна раўнялася 85,9 тыс. тон, у 1928 г. — 57 тыс. тон, у 1930 г. у кастрычніку — 39,3 тыс. тон; сталі адпаведна па гадох — 138,4 тыс. тон, 119,8 тыс. тон і 113,6 тыс. тон; пракат адпаведна: 99,9 тыс. тон, 87 тыс. тон, 79,8 тыс. тон. А калі ўзяць 1931 г. па месяцох, дык аказваецца: здабыча прадукцыі чыгуна ў ліпені раўнялася 28,2 тыс. тон, у жніўні — 29,8 тыс. тон, а ў кастрычніку ўжо — 23,9 тыс. тон; здабыча сталі ў ліпені раўнялася 108,6 тыс. тон., у жніўні — 99,7 тыс. тон, у верасьні — 92,7 тыс. тон, у кастрычніку — ужо толькі 67,7 тыс. тон, пракат — у ліпені 1931 года — 87,7 тыс. тон, у жніўні — 73,1 тыс. тон, у верасьні — 71,2 тыс. тон і ў кастрычніку размер яго зьнізіўся да 52,8 тыс. тон.

Гэтыя лічбы сьведчаць аб масьлядоўным звужваньні аб'ёму мэталюргіі ў Польшчы.

Яшчэ адна лічба. Як вядома, у Польшчы экспартаваўся пракат, дык вось у верасьні 1931 г. гэты экспарт пракату раўняўся 31,8 тыс. тон, а ў кастрычніку — ужо толькі 17,9 тыс. тон.

Цікава прывесьці некаторыя факты аб эканамічным становішчы Зах. Беларусі або, як гэта ў Польшчы называецца, аб усходніх крэсах.

Факты ўзятыя з польскіх газэт, гавораць аб далейшай ліквідацыі прамысловых і гандлёвых прадпрыемстваў, аб зьмяншэньні спажываньня прадуктаў харчаваньня, аб росьце беспрацоўя і г. д. Толькі на працягу 5 дзён лістапада ў г. Вільні закрылася 7 гандлёвых і прамысловых прадпрыемстваў («Дзеньнік Віленскі» ад 6/XI). Тая-ж газэта ў нумары ад 10/XI паведамляе аб значным зьніжэньні спажываньня мукі насельніцтвам, якое дасягае толькі 20 проц. патрэбнасьці.

За верасень месяц у г. Вільні закрылася 38 прамысловых і гандлёвых установ, побач з гэтым расьце лік апратэставаных вэксалёў, які дасягае за верасень м-ц 53.767 шт. на суму 9 млн. злотых, за кастрычнік па Віленскім ваяводзтве — 13.308 шт. на суму 2½ млн. злот, па Навагрудзкім ваяводзтве — 8.190 шт. на 4 млн. злотых, па Палескім ваяводзтве — 9.950 шт. на 1,5 млн. злотых і па Беластоцкім ваяводзтве — 2 тыс. шт. на 3.760 тыс. злотых. Аб гэтым паведамляе «Дзеньнік Віленскі» за 16-27 кастрычніка.

Варта падаць яшчэ такі факт, які ярка адлюстроўвае эканамічнае становішча сялянства.

«Дзеньнік Віленскі» за 27 кастрычніка піша аб становішчы вёскі наступнае: вынікі досьледаў навуковага інстытуту ў Пулавах па пытаньні аб прыбытковасьці сялянскай сям'і гавораць: дзенны даход аднаго члена сялянскай сям'і ў 1926-27 годзе раўняўся 2 злот. 76 гр., у 1927-28 г. раўняўся—3 зл. 15 гр., 1928-29 г.—1 зл. 57 гр. і ў 1929-30 г.—12 гр.

А калі вы пераведзеце злоты на капейкі, нават па мінімальным курсе, то можаце ўбачыць, колькі капеек даходу ў дзень прыпадае на аднаго члена сялянскай сям'і ў 1929-30 г. (злоты—раўняецца 22 кап.). Таварышы могуць вылічыць самі.

Вось гэтымі невялічкімі фактамі я і абмяжуюся ў характарыстыцы эканамічнага становішча наасобных капіталістычных дзяржаў.

Якія вынікі мы можам з гэтага зрабіць? Яны могуць быць наступныя:

1. Наглядаецца сыстэматычнае паглыбленьне эканамічнага крызісу капіталістычных краін.

2. Гэты крызіс яшчэ больш абвастрае супярэчнасьці паміж капіталістычнымі краінамі.

3. Усё больш пагаршаецца матар'яльнае становішча рабочай клясы і працоўнага сялянства.

4. У сувязі з гэтым пашыраецца і ўзмацняецца рэвалюцыйнасьць рабочых мас і ўсіх працоўных. Гэта пашырае фронт клясавай барацьбы.

5. Узмацняюцца супярэчнасьці аміж капіталістычнымі краінамі, з аднаго боку, і СССР—з другога.

Выхад з крызісу капіталісты шукаюць у паваленьні пацюку на калёніяльныя дзяржавы, за кошт новага падзелу сьвету і за кошт Савецкага Саюзу. Прыкладамі такога імкненьня імпэрыялізму могуць служыць апошнія падзеі ў Манчжурыі і апошнія да японскай інтарэзацыі з боку Лігі Нацый.

Таму невыпадкова, што ў апошнія часы зьявілася адкрытая думка ў французскім і ангельскім друку некаторых імпэрыялістаў, якія рэкамэндуюць свайму ўраду пасьледаваць прыкладу Японіі і пачаць акупацыю Інда-Кітаю і інш. каланіяльных дзяржаў.

Вось гэтыя факты раскрываюць усю мэханіку Лігі Нацый, якая санкцыянавала для Японіі акупацыю Манчжурыі. Значыць, думка імпэрыялістычных дзяржаў накіравана на тое, каб прыступіць да падзелу калёній, да захопу калёніяльных рынкаў, бо гэта ім трэба для разьвязкі крызісу перавытворчасьці капіталістычнай эканомікі.

Адсюль вынікаюць і нашы задачы. Мы павінны:

1. Пільна сачыць за дзеяньнямі нашых ворагаў.

2. Узмацніць абароназдольнасьць нашай краіны.

Лепшым узмацненьнем нашай абароназдольнасьці будзе далейшае павялічэньне тэмпаў індустрыялізацыі нашай краіны і наогул сацыялістычнага будаўніцтва, а таксама ўзмацненьне баяздольнасьці нашай Чырвонай арміі.

3. Мы павінны пахіхільна працаваць па хутчэйшым вызваленьні СССР ад эканамічнай залежнасьці ад капіталістычных краін.

Факты эканамічнага росту Савецкага Саюзу і эканамічнага заняпаду капіталістычных краін я прывёў вам для таго, каб паказаць, што адбываецца два процілеглыя працэсы. З аднаго боку, мы наглядаем магутны і няспынны рост на ўсіх вучастках сацыялістычнага будаўніцтва ў Савецкім Саюзе, з другога боку, мы наглядаем далейшае паглыбленьне эканамічнага крызісу ў дзяржавах капіталізму. Прычым, калі перад намі адкрываюцца нявымерна вялікія перспэктывы далейшага росту сацыялізму, то ў капіталістаў няма ніякага прасьвету для вылечваньня эканамічнага крызісу і ніякія рэцэпты Гувэра, Брыяна, або іншых эўрапейскіх сааклянічых дыплёматаў і палітыкаў не дапамогуць вылечыць капіталізм ад пагібелі, якая набліжаецца.

Крызіс капіталізму будзе і далей разьвівацца. Адзіным выхадам з яго зьяўляецца шлях пралетарскай рэвалюцыі.

III. Асноўныя задачы чацьвёртага, заключнага году пяцігодкі

Перад тым, як агаласіць кантрольныя лічбы на 1932 г., я папярэдне зраблю некалькі заўваг. Трэба выходзіць з таго, што Саўнаркам БССР прадстаўляе на сэсію ЦВК праект кантрольных лічбаў, які мы ўносім на разгляд ураду СССР. Натуральна, што пры канчатковай сьвёрстцы кантрольных лічбаў, могуць і будуць унесены наасобныя карэктывы па разьве галін наших праектыровак, бо народна-гаспадарчы плян БССР ня можа быць адарваны ад усяго народна-гаспадарчага пляну Саюзу ССР. Ён павінен быць, як гэта было і да гэтага часу, неадлучнай, складанай часткай пляну ўсяго Савецкага Саюзу.

Пры складаньні кантрольных лічбаў, СНК БССР кіраваўся наступнымі ўстаноўкамі.

Па-першае, мы выходзілі з абавязковага выкананьня асноўнага лёзунгу нашай партыі — ажыцьцявіць пяцігодку за чатыры гады, а 1932 год—чацьверты год—зьяўляецца заключным годам пяцігодкі.

Па-другое, мы выходзілі з таго, каб народна-гаспадарчым плянам на 1932 г. прадугледзець абавязковае замацаваньне ўжо дасягнутых посьпехаў і дабіцца далейшага ўздыму разьвіцьця сацыялістычнага будаўніцтва яшчэ на больш высокую ступень.

Гэты год мае асаблівае значэньне яшчэ і таму, што ён будзе ня толькі заключным годам першай пяцігодкі, але і годам пераходу да новай пяцігодкі.

Пры складаньні нашых кантрольных лічбаў, мы кіраваліся яшчэ і тым, што для ўсяго Саюзу ССР асноўнымі ўстаноўкамі зьяўляюцца: канцэнтрацыя галоўных сіл, увагі і сродкаў на важнейшых вядучых галінах індустрыі і ўсёй народнай гаспадаркі.

Для Саюзу гэтымі ўстаноўкамі зьяўляецца наступнае: мэталь, вугаль, транспарт і айчынная машынабудоўля. Гэта азначае, што наша партыя і савецкі ўрад усім правільна канцэнтруюць сваю ўвагу на гэтых вузлавых пытаньнях, якія дапамагаюць далейшаму і больш хутчэйшаму вызваленьню Саюзу ССР ад эканамічнай залежнасьці ад капіталістычных краін. Гэта—галоўная наша задача.

Таму мы павінны ўсямерна пасквараць разгортваньне тых галін вытворчасьці, якія вырашаюць гэтую галоўную задачу. Зусім зразумела, што і ўсе віды вытворчасьці Савецкага Саюзу павінны пашырацца хуткімі тэмпамі, але галоўную сілу мы канцэнтруем на гэтых вузлавых пытаньнях, якія аднача-сова забясьпечваюць далейшае разьвіцьцё ўсёй народнай гаспадаркі.

Зразумела, што ў сувязі з пашырэньнем сацыялістычнай вытворчасьці, з ростам новых гігантаў прамысловасьці ў нас значна павялічылася патрэбнасьць у апале, і тыя размеры здабычы вугалю, якія ў нас былі раней, ня могуць задаволіць запатрабаваньняў вырослай гаспадаркі ў апале.

Тое-ж самае і па мэталі. Бурны рост усіх відаў вытворчасьці павялічыў у велізарнай ступені патрэбнасьць у мэталі. Мы павінны пастаўіць задачу на 1932 г. — ня менш, як у два разы павялічыць здабычу мэталю.

Аб значэньні сацыялістычнай рэканструкцыі транспарту таксама ўсім вядома. Транспарт зьяўляецца асноўнай артэрыяй, па якой перакідаюцца ўсе матар'яльныя рэсурсы Савецкага Саюзу на тыя вучасткі сацыялістычнага фронту, дзе нам найбольш патрэбны гэтыя матар'яльныя рэсурсы. І калі наш транспарт ня справіцца з гэтай задачай,—ён можа затармазіць ажыцьцяўленьне павышаных тэмпаў разьвіцьця сацыялістычнага будаўніцтва. У гэтым выпадку можа атрымацца, што ў адным месяцы будзе лішак матар'яльных сродкаў, а ў другім месяцы іх ня хопіць. Таму мы павінны аддаць максымум увагі наладжваньню работы транспарту. У прыватнасьці ўжо патрэбна ўсімі сіламі ўберагчы чыгункі ад сьнежных завей, каб не паўтарыць мінулай гісторыі.

Вось гэтыя паказаныя ўстаноўкі і зьяўляюцца галоўнымі для ўсіх арганізацый, якія працуюць над выкананьнем гаспадарчых плянаў. Яны таксама цалкам і поўнасьцю адпавядаюць інтарэсам усіх частак Саюзу, у тым ліку і інтарэсам усіх нацыянальных рэспублік і абласьцей.

Выходзячы з вышэйпаказаных установак намі і складзен праект народна-гаспадарчага пляну на 1932 г.

Перайду да агалашэньня паказальнікаў, характарызуючых аб'ём кантрольных лічбаў на 1932 г., якія прыняты СНК і ўносяцца як праект на зацьвярджэньне сэсіі.

По прамысловасьці — мы бралі такую ўстаноўку, каб яшчэ больш павялічыць вядучую ролю прамысловасьці БССР у адносінах да ўсёй народнай гаспадаркі і пашырыць пралетарскую базу БССР, а тым самым і ўзмацніць кіруючую ролю пралетарыяту ў сацыялістычным будаўніцтве. Таму мы запраектавалі прырост валавой прадукцыі прамысловасьці на 68,6 проц. Мы павінны выпрацаваць прамысловай прадукцыі на суму 1,422.500 тыс. руб., у тым ліку прырост валавой прадукцыі па саюзнай прамысловасьці ў БССР вызначаецца намі на 54.6 проц. з даведзеньнем аб'ёму яе да 163.380 тыс.

Па прамысловасьці ВСНГ БССР прырост прадукцыі — на 59,9 проц. з даведзеньнем яе аб'ёму да 634.636 тыс. р. Па прамысловасьці НКСнабу прырост на 64,6 проц., або даведзеньне аб'ёму прадукцыі да 295.500 тыс. руб. Па мясцовай прамысловасьці — 93 проц. прыросту, з даведзеньнем агульнага аб'ёму прадукцыі мясцовай прамысловасьці да 71.656 тыс. руб. Па саматужнай прамысловасьці прырост на 95,1 проц., а агульным аб'ёмам у 244,4 млн. руб. і прырост прадукцыі на іншай дробнай прамысловасьці на 73,6 проц.

Капіталаўкладаньні ў прамысловасьць ВСНГ намі праектуюцца ў аб'ёме 70,5 млн. руб., у тым ліку на жыльлёвым будаўніцтве і сацыяльна-бытавых запатрабаваньнях 11.116 тыс. рублёў, а па прамысловасьці Наркамснабу капіталаўкладаньні вызначаюцца ў аб'ёме 16.502 тыс. руб. У адпаведнасьці з гэтым будзе пашырацца і колькасьць рабочых.

Сярэднясьпісачная колькасьць рабочых па прамысловасьці ВСНГ запраектавана на 1932 г. у ліку 68 тыс. чалавек, што дае прырост супроць 1931 г. на 36 проц.

Павышэньне прадукцыйнасьці працы па прамысловасьці ВСНГ мы вызначаем на 26,9 проц., па прамысловасьці Наркамснабу—на 24 проц.

Зьніжэньне сабекошту па прамысловасьці ВСНГ вызначаецца ў размеры 8,1 проц., а па Наркамснабе—у 7 проц.

На якасных паказальніках (узыом прадукцыйнасьці працы і зьніжэньне сабекошту) я хачу спэцыяльна спыніцца для таго, каб зьвярнуць увагу сэсіі на гэтае важнейшае пытаньне. Мы не ажыцьцявілі пляну выкананьня якасных паказальнікаў 1931 г. Напрыклад, было намечана ўзьняць прадукцыйнасьць працы па прамысловасьці ВСНГ на 33 проц., а ўзьнялі ўсяго на 22,1 проц. Зьніжэньне сабекошту па прамысловасьці ВСНГ мы намецілі на 9.2 проц., а зьнізілі, проста сорамна гаварыць, толькі на 1,7 проц. А зьніжэньне сабекошту па прамысловасьці Наркамснабу намецілі ў 8 проц., зьнізілі-ж толькі на 3 проц.

Запраектаваныя якасныя паказальнікі на прамысловасьці на 1932 год павінны быць выкананы абавязкова і безагаворачна. Якасьць работы прадпрыемстваў — гэта асноўная генэральная задача на 1932 год. Зьніжэньне сабекошту, узьдым прадукцыйнасьці працы, паляпшэньне прадукцыі, упарадкаваньне ўсёй вытворчасьці — вядучая задача для ўсяго пляну на 1932 год.

Пры ажыцьцяўленьні запраектаваных кантрольных лічбаў па прамысловасьці на 1932 год мы зможам да канца году перавыканаць увесь аб'ём пяцігодкі па прамысловасьці ВСНГ на 12,2 проц., у тым ліку па будматэр'ялах—на 2,4 проц., па торфе—на 88,2 проц., па мэталі—на 30,9 проц. Па валавой прадукцыі саюзнай прамысловасьці ўвесь аб'ём пяцігодкі будзе перавыканан на 5,4 проц. і па капітальным укладаньні ў прамысловасьць ВСНГ—на 9,4 проц.

Да капітальнага будаўніцтва ў 1932 годзе трэба падыходзіць з асаблівай увагай, бо яно забясьпечвае праную пашыранага аднаўленьня (васпрозводства) на базе аграмадзкай народнай гаспадаркі.

Увесь аб'ём капітальных укладаньняў у будаўніцтва намі запраектован у суме 524,4 млн. руб. (без Вастэнту і НН Шляхоў), з якіх на частке будаўніцтва праектуецца 359 млн. руб.

Калі параўнаць праграму чыстага будаўніцтва з плянам 1931 г., то ўбачым, што памы намечана на 1932 г. павялічваць аб'ём капітальнага будаўніцтва амаль у два разы.

Для выкананьня ўсёй будаўнічай праграмы нам неабходна наступная колькасьць асноўных відаў будаўнічых матар'ялаў: цэглы—677 млн. шт., цэменту — 49 тыс. тон, лесу кругляка—637 тыс. кбм., лесу пілянага—759 тыс. кбм., жалеза — 7.328 тоны, жалеза гатунковага—3.740 тон.

Выходзячы з гэтага, мы і будуем свае плян вырабу мясцовых будаўнічых матар'ялаў. Папярэджваю, што мы ў 1931 г. зрабілі ня ўсё, што можна было зрабіць па разьвіцьці прамысловасьці будаўнічых матар'ялаў. Мы не мабілізавалі ўсіх сродкаў, якія ў нас ёсьць, на выкананьне будаўнічай праграмы. Нават такіх будматэр'ялаў, як цэгла, мы мелі недахват. Больш таго, мы не арганізавалі як належыць выраб вапны.

Працяг на 3 стар.

КАНТРОЛЬНЫЯ ЛІЧБЫ НАРОДНАЙ ГАСПАДАРКІ БССР НА ЧАЦЬВЕРТЫ ЗАКЛЮЧНЫ ГОД ПЯЦІГОДКІ

Даклад старшыні СНК БССР тав. ГАЛАДЗЕДА на II сэсіі ЦВК БССР X скліканьня (ПРАЦЯГ)

Як ня сорамна, але нам прыходзілася ўвозіць у Беларусь вапну з Крыму, у той час, калі мы можам гэту галіну разгарнуць у шырокіх маштабах у кожным раёне.

Таму задачай 1932 г. зьяўляецца максымальнае разгортваньне на падставе мабілізацыі мясцовых рэсурсаў вырабу мясцовых будаўнічых матар'ялаў. Для таго, каб ажыцьцявіць праграму будаўніцтва ў 1932 г., неабходна, па-першае, дапаўненьне будаўнічых матар'ялаў да кожнай пасобнай будоўлі, па-другое, ліквідаваць абязьлічку ў адносінах фінансаваньня і размеркаваньня будаўнічых матар'ялаў, па-трэцяе, зьнішчыць асноўныя недахопы будаўніцтва, якія мелі месца ў 1931 г. Трэба пераходзіць да больш лёгкага тыпу будаўніцтва—да стандартнага будаўніцтва і на шырокае ўкараненьне вырабу новых больш лёгкіх будаўнічых матар'ялаў.

Я хочу спэцыяльна спыніцца на наступным пытаньні. Старшыні РВК або кіраўнікі цэнтральных установаў, якія прыходзілі да мяне больш за ўсё ставяць пытаньне толькі аб будаўніцтве, зусім мала закранаючы задачы наладжваньня вытворчасьці. Зразумела, ня дрэнна, што людзі займаюцца будаўніцтвам. Ім трэба займацца, мы і ў далейшым ня будзем звужваць будаўнічай праграмы, наадварот, гэтыя праграмы будуць пашырацца. Дрэнна, аднак, тое, што работнікі, клапоцячыся аб будаўніцтве, забываюць аб наладжваньні вытворчасьці.

Цэнтральнай задачай 1932 г. зьяўляецца далейшае і лепшае наладжваньне вытворчасьці. Мы пашырылі вытворчы фронт, але слабавата яго яшчэ арганізавалі. Трэба ў 1932 годзе цалкам на ўсе 100 проц. скарыстаць і нагрузіць гэтыя асноўныя капіталы, якія ў нас ёсьць і ў прамысловасьці і ў іншых галінах народнай гаспадаркі.

Таму якасьць работы, пытаньні павышэньня якасьці прадукцыі і выкананьня ўсіх якасных паказальнікаў—зьяўляюцца тымі ўмовамі, пры ажыцьцяўленьні якіх мы зможам дабіцца лепшай арганізацыі сацыялістычнай вытворчасьці, больш скарыстаць асноўны капітал, больш поўна яго нагрузіць і тым самым павялічыць матар'яльныя рэсурсы нашай пралетарскай дзяржавы. А гэтыя матар'яльныя рэсурсы дапамогуць нам разгарнуць і новую будаўнічую праграму, дапамогуць адначасова павялічваць тэмпы нашага сацыялістычнага будаўніцтва. Мы будзем адначасова расьці ня толькі ў шырыню, але і ў глыбіню.

Тав. Сталін у сваёй гістарычнай прамове на нарадзе гаспадарнікаў высунуў 6 умоў і якраз для таго, каб лепш арганізаваць сацыялістычную вытворчасьць і тым самым забясьпечыць пабудову сацыялізму ў нашай краіне. Ён гаварыў аб тым, што павінны рабіць бальшавікі і ўся рабочая кляса ў гэтай галіне, якія фактары трэба прывесьці ў рух, каб тую сацыялістычную вытворчасьць і тэхнічную базу, якія мы ўжо маем у нашых руках, каб тыя асноўныя капіталы, якія мы значна павялічылі за гэтыя гады, каб усё гэта скарыстаць, дабіцца максымальнага эфэкту і тым самым далей пашыраць і паглыбляць фронт індустрыялізацыі.

Трэба, на-мойму, у кожным гаспадарчым наркамаце, у кожнай гаспадарчай цэнтральнай установе вылучыць да пачатку 1932 г. спэцыяльнага адказнага працаўніка — аднаго з намесьнікаў наркомаў, або кіраўнікоў, які-б кіраваў і поўнасьцю адказваў за лепшую арганізацыю вытворчасьці.

Пасьля зацьверджаньня праграмы на 1932 г. галоўную ўвагу трэба сканцэнтраваць на праверцы выкананьня зацьверджаных вытворчых пляноў.

Цяпер аб праблеме апалу. Паводле арыентовачных падлікаў, патрэба ў апале для БССР на 1932 г. складае 2.880 тыс. тон. Пашырэньня завозу апалу з-за межаў БССР ня будзе (Данецкі вугаль). Мы павінны аддаць галоўную ўвагу мясцоваму апалу і як можна больш скарыстаць для гэтай мэты торф.

Мы праектуем на 1932 г. выраб торфу ў аб'ёме 1.964 тыс. тон, у тым ліку па Белторфе 1.286 тыс. тон. Праграма вельмі вялікая, як бачыце, але мы павінны яе выканаць. Прычым, выконваць лепш, чым у бягучым годзе.

Сёлета мы здабылі 584 тыс. тон торфу. Праграма-ж наша складала 900 тысяч тон. Мы недавыканалі плян. Але гэта яшчэ ня ўсё. Мы яшчэ дрэнна здабываем торф, а ва многіх мясцох праспалі тарфяны сэзон. Не змаглі нават добра высушыць здабыты торф. Таму ўжо цяпер адчуваем вялікія труднасьці ў снабжэньні нашай гаспадаркі апалам.

Нават такое прадпрыемства, як Асінбуд, яно не забясьпечыла сабе неабходнай колькасьцю торфу. Асінторф праваліў праграму здабычы. Вось прычына таго, што наша асноўная энэргетычная ўстаноўка — 1-я ДРЭС—мела перабоі ў сваёй рабоце і тым самым стварыла перабоі ў рабоце прамысловых прадпрыемстваў Віцебску, Воршы і Магілева. Некалькі дзён Асінбуд ня мог падаваць электраэнэргіі на фабрыкі і заводы Віцебску, Воршы, Магілева. На гэтым пацярпелі страт каля 1 млн. руб.

Нашы гаспадарнікі не змаглі забясьпечыць нармальнай работы Асінбуду. Мы разглядалі гэта пытаньне на ЭКАСА і зьнялі за гэта з работы дырэктара торфараспрацовак. Трэба прыняць усе меры, каб у наступным годзе поўнасьцю забясьпечыць Белдрэс торфам.

Каб зараз-жа наладзіць больш-менш нармальную работу Белдрэсу, мы парашылі завозіць туды торф з іншых раёнаў, а таксама некаторую колькасьць мазуту, пры дапамозе якога можна было-б лепш паліць торф, які там ёсьць.

У галіне электрыфікацыі намячаем вялікі аб'ём работы. Капіталаўкладаньні ў электрабудаўніцтва на 1932 г. запраектаваны ў суме 29 млн. руб. Выпрацоўку электраэнэргіі мы павінны павялічыць да 247 млн. квт. гадз. з 146 млн., якія мы выпрацавалі ў 1931 г.

Цяпер дазвольце перайсьці да нашых праектаваньняў па сельскай гаспадарцы.

Галоўнай задачай у галіне сельскай гаспадаркі на 1932 г. зьяўляецца арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў. Неабходна намеціць і ажыцьцявіць рад практычных канкрэтных мерапрыемстваў у гэтай галіне. Апрача гэтага трэба ўмацаваць далейшае разьвіцьцё і ўмацаваньне саўгасаў.

Важнейшыя праблемы — фарсаванае разьвіцьцё жывёлагадоўлі, тэхкультур, індустрыялізацыя сельскай гаспадаркі, яе электрыфікацыя, пашырэньне будаўніцтва МТС і механізацыя с.-г. працэсаў, павышэньне ўраджайнасьці, спэцыялізацыя саўгасаў і калгасаў па вядучых галінах.

Мы ставім перад сабою задачу арганізаваць работу ўсіх партыйных, савецкіх, зямельных і інш. гаспадарчых арганізацый у справе далейшай калектывізацыі такім чынам, каб праз ажыцьцяўленьне генэральнай задачы— арганізацыйна - гаспадарчага ўмацаваньня калгасаў — дабіцца завяршэньня ў асноўным суцэльнай калектывізацыі БССР у 1932-33 г. У гэтай галіне мы павінны кіравацца вядомай пастановай ЦК УсеКП(б) ад 2 жніўня 1931 г.

Выходзячы з гэтай дырэктывы, мы ў кантрольных лічбах запраектавалі, што ў сярэднім у БССР да канца 1932 г. будзе ахоплена калгасамі ня менш 65 проц. бядняцка-серадняцкіх гаспадарак. Па Саюзе ў цэлым прадугледжваецца калектывізацыя бядняцка-серадняцкіх гаспадарак у сярэднім у аб'ёме 72-75 проц.

Агульны размер усёй пасеўнай плошчы мы вызначаем у 4.150 тыс. гэкт., што дасьць прырост у параўнаньні з 1931 г. на 16,5%, у тым ліку па саўгасах прырост вызначаецца на 129,3 проц. Запраектавана давесьці колькасьць трактарных станцый па БССР да 97 з тым, каб трактарны парк павялічыць да канца 1932 г. да 107 тыс. конскіх сіл. З гэтага відаць, што ў нас будзе ня менш 1 МТС на раён, а ў некаторых раёнах і па 2 МТС.

Па жывёлагадоўлі мы праектуем давесьці лік коняй да 930 тыс. шт. — прырост на 5 проц. Стада буйной рагатай жывёлы трэба давесьці да 2.208 тыс. — рост на 35,7 проц. Гэта задача вялікая, але мы павінны яе выканаць.

Па саўгасах колькасьць усёй жывёлы павінна павялічыцца на 72 проц., у тым ліку кароў — на 64,4 проц., у калгасных таварных фермах — на 45,5 проц., у тым ліку кароў — на 92,3 проц.

Па сялянскай кааперацыі неабходна павялічыць стада на 40 проц., у тым ліку кароў — на 25 проц.

Праектуем давесьці стада сьвіней да 3.800 тыс. да канца году, або даць прырост на 39,7 проц.

Наша задача — дабіцца ў асноўным вырашэньня ў 1932 г. праблемы жывёлагадоўлі.

Вопыт 1931 г. паказаў, што мы яшчэ дрэнна спраўляемся з разьвіцьцём буйной сьвінагадоўлі. Аказваецца, што сьвіньня гэта вельмі «інтэлігентная» жывёла, якая любіць вельмі добры догляд за сабою, яна, аказваецца, ня любіць, каб з ёй па-сьвінску абыходзіліся, як гэта мае месца ва многіх выпадках у нашых саўгасных і калгасных гаспадарках.

Практыка паказала, што там, дзе на чале саўгасу і сьвінагадоўчай калгаснай таварнай фермы сталі добрыя гаспадары, справа пасунулася шпаркімі тэмпамі наперад. Там-жа, дзе былі дрэнныя гаспадары, чыноўнікі, або такія людзі, якія ня ўмеюць і ня хочуць «далікатна» абыходзіцца са сьвіньнёю, ёсьць цэлы рад прарываў. Вопыт буйных сьвінагадоўчых гаспадарак мы пачалі набываць толькі ў 1931 г. Гэты вопыт гаворыць, што буйныя сьвінагадоўчыя гаспадаркі патрабуюць асаблівай увагі, лепшай арганізатарскай работы. Трэба вывучыць гэту справу па сутнасьці, залезьці, як гавораць, у глыбіню і не кіраваць «наогул».

Імянна таму, што ў нас з падборам кадраў для сьвінагадоўчых саўгасаў і калгасных таварных фэрм справа стаяла дрэнна, у некаторых саўгасах і калгасных фермах адыход маладняка даходзіў нават да 40 проц.

Падам адзін прыклад няўменьня гаспадарыць у сьвінагадоўчым саўгасе. Гутарка ідзе аб сьвінасаўгасе «Негарэлае».

Калі туды прыехалі прадстаўнікі Менску і запыталіся, як стаіць справа, дык дырэктар саўгасу мог паскардзіцца толькі вось на што: «Справа ў мяне так, нічога, але з пастухамі дрэнна. Няма каму сьвіней пасьвіць».

Калі ў дырэктара саўгасу запыталіся, як-жа ў яго было раней, ён адказаў: «Раней было лепш, бо да мяне на лета прыяжджалі студэнты на практыку з розных ВНУ СССР, і таму было каму пасьвіць сьвіней, а зараз яны паехалі. І адразу ня стала пастухоў. Няма каму сьвіней даглядаць, і таму яны пачалі дохнуць».

Як бачыце, чалавек дадумаўся да таго, каб студэнтаў, што прыехалі на практыку з замежжаў БССР, зрабіць пастухамі (сьмех), і гэта замест таго, каб рацыянальна скарыстаць іх і самому ад іх чаму-небудзь навучыцца. Гэта, на вялікі жаль, не анэкдот, а праўда.

Такім чынам вырашэньне задачы жывёлагадоўлі зьяўляецца цэнтральнай праблемай сельскай гаспадаркі. Першае, з чаго трэба пачынаць, гэта з падбору кадраў. Трэба знаходзіць лепшых людзей і сярод калгасьнікаў і сярод працоўных мас і ставіць іх на гэту справу. А ў нас ёсьць добрыя гаспадары-калгасьнікі. Трэба іх сьмялей браць і вылучаць на кіраўніцтва цэлымі гаспадаркамі.

Трэба адначасова стварыць матар'яльную зацікаўленасьць для тых людзей, якія даглядаюць жывёлу наогул і ў прыватнасьці сьвіней. Трэба перайсьці на прэміяльна-зьдзельную сыстэму ў залежнасьці ад таго, наколькі сьвіньня дасьць прыбытак, каб вырашыць мясную праблему. А гэта ўсё залежыць ад догляду. Кожны з нас, пачынаючы ад старшыні СНК, наркома і канчаючы рабочым, які даглядае сьвіньню, павінен ведаць справу разьвіцьця жывёлагадоўлі. Няправільна цурацца гэтых задач, бо гэта ёсьць сапраўдны бальшавіцкі падыход да канкрэтнага вырашэньня пастаўленай партыяй праблемы, а праблема разьвіцьця жывёлагадоўлі перад органамі БССР пастаўлена, як асабліва вялікая, і галоўным чынам у галіне сьвінагадоўлі.

Ня спыняючыся спэцыяльна на задачах разьвіцьця іншых відаў жывёлагадоўлі, я толькі падкрэсьлю, што нам трэба налегчы на разьвіцьцё іншай дробнай хуткасьпелай жывёлы, як трусы, індычкі і г. д. Гэта ў значнай меры і ў хуткім часе забясьпечыць задачу мясаснабжэньня.

Пытаньні паляпшэньня гарадзкой і жыльлёвай гаспадаркі мы датэтуль не аддавалі належнай увагі, якое заслугоўвае гэта галіна народнай гаспадаркі. У апошнія часы, як вы ведаеце, была спэцыяльная пастанова пленуму ЦК УсеКП(б) аб наладжваньні камунальнай гаспадаркі з мэтай паляпшэньня абслугоўваньня бытавых і жыльлёвых патроб рабочае клясы.

Грунтуючыся на гэтых дырэктывах, мы запраектавалі павышаную нагрузку па камунальным і жыльлёвым будаўніцтве, намячаючы капітальныя ўкладаньні ў жыльлёвае будаўніцтва ў размеры 41.640 тыс. руб. — прырост супроць 1931 г. на 45.1 проц. і ў камунальных прадпрыемствах у суме 31.699 тыс. руб.—рост на 215.6 проц.

Трэба пабудаваць ня менш 480 тыс. кв. м. жылой плошчы, г. зн. павялічыць жыльлёвае будаўніцтва супроць 1931 г. на 140 проц. Задача нялёгкая, але яе трэба выканаць, прыцягваючы ўсю ўвагу гарадзкіх саветаў, прафсаюзных і партыйных арганізацый, органаў жыльлёвай кааперацыі на мабілізацыю ўсіх мясцовых рэсурсаў.

Па транспарце і сувязі вызначаны наступныя праектаваньні. Укладаньні ў дарожнае будаўніцтва павялічваюцца на 19,4 проц. Завоз аўтамашын у БССР праектуецца ў 2.750 шт. Капітальныя ўкладаньні ў аўтагаспадарку — у 23.650 тыс. руб., а ў водны транспарт — у размеры 13.777 тыс. руб. — рост на 156,2 проц. Грузазварот па водным транспарце вызначаецца ў аб'ёме 1.160 тыс. тон — рост у 145,4 проц.

Па сувязі капітальныя ўкладаньні запраектаваны ў размеры 138.158 тыс. руб. з прыростам на 111,4 проц. супроць 1931 г.

Па таваразвароце і снабжэньні мы дасем значны размах. Раздробны таваразварот у 1932 г. павялічваем на 42,2 проц., прычым асноўнае павялічэньне дробнага таваразвароту пойдзе па лініі закрытых рабочых і ваенных кааператываў (на 194,7 проц.).

Задача паляпшэньня снабжэньня рабочай клясы ў 1932 г. застаецца галоўнейшай. Таму мы надаем вялікую ўвагу разьвіцьцю савецкага гандлю пашырэньню гандлёвай сеткі і самазагатоўкам нізавых каапэрацыйных арганізацый.

Мы павінны ў бліжэйшы час разгарнуць значную колькасьць савецкіх крам у рабочых населішчах, у раённых цэнтрах, каб тым самым палепшыць справу снабжэньня. Трэба шляхам павялічэньня самазагатовак ЗРК, ЗВК, ТПО і іншых каапэрацыйных арганізацый дабіцца павялічэньня таваразвароту за лік мабілізацыі мясцовых рэсурсаў.

Наш размах у галіне падрыхтоўкі кадраў характарызуецца павялічэньнем капітальных укладаньняў у гэту галіну з 23,3 млн. руб. у 1931 г. да 42,5 млн. руб. на 1932 г. Справу падрыхтоўкі кадраў мы ставім, як адну з галоўных.

Па падрыхтоўцы кваліфікаванай рабочай сілы таксама праектуецца значны рост асыгнаваньняў. Мы мяркуем давесьці сетку фабзавучаў і аналёгічных школ да 234 адзінак — прырост на 312 проц., а колькасьць вучняў у іх павялічыць на 73,6 проц. Прычым у 1932 годзе выпуск фабзавучаў вызначаем у 6.265 чал. і з курсаў сярэдняй кваліфікацыі,—26.697 чал., а праз масавыя курсы — да 102.300 чал.

Па культурна-сацыяльных мерапрыемствах я абмяжуюся толькі агульнымі лічбамі. Галоўную задачу — увядзеньне ўсеагульнага абавязковага навучаньня на базе 4-хгодкі — мы ў асноўным вырашылі ў 1931 г. У 1932 г. мы павінны дабіцца далейшага паглыбленага вырашэньня гэтай задачы і напэўна пасьля ўжо будзем ставіць задачу правядзеньня ўсеагульнага абавязковага навучаньня на базе 7-годкі.

У гэтым напрамку мы і праектуем адпаведныя мерапрыемствы па адкрыцьці пятых груп з мэтай ахапу скончыўшых 4-хгодку ўжо ў гэтым годзе.

Лік вучняў у першым канцэнтры мы думаем давесьці да 695.800 чал. — павялічэньне на 3.6 проц., у другім канцэнтры — да 186.181 чал. — павялічэньне на 70,8 проц.

Вялікія мерапрыемствы праектуюцца і па лініі дашкольнага выхаваньня (сады, ачагі і г. д.) і арганізацыі пляцовак. У галіне палітасьветы, у прыватнасьці, мы думаем адкрыць 1.406 сельскіх дамоў культуры — павялічэньне іх колькасьці супроць 1931 г. на 213 проц.

Намячаюцца таксама значныя мерапрыемствы і ў галіне кінофікацыі, разьвіцьця навукі, друку і арганізацыі для ўсяго матар'яльнай базы.

Па лініі аховы здароўя і сацыяльнага забесьпячэньня працоўных намячаюцца значныя ўкладаньні. У прыватнасьці, лік ложкаў у бальніцах думаем павялічыць на 25,4 проц. з далейшым пашырэньнем мадычных пунктаў на прамысловых прадпрыемствах, для сэзонных рабочых, рабочых торфараспрацовак, саўгасаў і калгасаў. Мяркуем мадычныя пункты пашырыць на 93 проц.

У адпаведнасьці з запраектаванымі кантрольнымі лічбамі народнай гаспадаркі і культуры на 1932 г., мы склалі і фінансавы плян, які павінен забясьпечыць ажыцьцяўленьне паказаных мерапрыемстваў. Фінансавы плян вызначаецца ў размеры 788,1 млн. руб. Дзяржаўны бюджэт мы запраектавалі з прыростам на 72,5 проц. з даводзеньнем яго аб'ёму да 300 млн. руб. брута. Па мясцовых бюджэтах мы запраектавалі рост на 47,7 проц., з даводзеньнем іх аб'ёму да 204 млн. руб.

Трэба адзначыць, што і ў мясцовы, і ў рэспубліканскі бюджэты будуць унесены неабходныя карэктывы (бязумоўна ў бок некаторага іх зьмяншэньня). Адначасова мы намячаем плян мабілізацыі сродкаў. Гэтыя пляны разьбіваюцца на абавязковыя плацяжы, на сродкі, якія мабілізуюцца каапэрацыйнымі органамі, і на сродкі, якія атрымліваюцца ад дзяржаўных пазык, укладаў у ашчадкасы і г. д. Аб'ём пляну мабілізацыі сродкаў намячаецца ў размеры 194 млн. руб.

Спыняючыся на важнейшых бягучых гаспадарчых задачах, трэба адзначыць, што справа выкананьня бягучых гаспадарчых кампаній, я-б не сказаў, што стаіць добра. Тэрміны, устаноўленыя для сканчэньня збожжазагатовак, ужо прайшлі, а выканалі плян збожжазагатовак (без звароту насенных пазык і без памольнага збору) усяго ў размеры 75,3 проц. да саюзнага пляну і на 66,3 проц. нашага пляну, які мы вызначылі ў парадку сустрэчнага.

«Праўда» ня раз пісала, што Беларусь па збожжазагатоўках цягнецца ў абозе самых адсталых раёнаў. Тым больш сорамна, што ў нас па сутнасьці невялікі плян збожжазагатовак — усяго якіх-небудзь 11 млн. пуд. А вы ведаеце, што гэты плян не забясьпечвае снабжэньня Беларусі хлебам. Нам прыходзіцца завозіць яго з-за межаў БССР. Савецкі Саюз ідзе на тое, каб хлеб да нас прывозіць, але дрэнна гаварыць аб яго прывозе ў Беларусь тады, калі мы свайго пляну ня выконваем. Мы ня можам цярпець такога становішча, каб БССР па збожжазагатоўках цягнулася ў хвасьце іншых раёнаў Савецкага Саюзу.

Сэсія ЦВК павінна заклікаць усё бядняцка-серадняцкае і калгаснае сялянства да таго, каб у бліжэйшыя-ж дні скончыць збожжазагатоўкі.

БССР ня дрэнна справілася з выкананьнем пляну адгрузкі бульбы. Тут мы апынуліся на вышыні. А возьмем, скажам, тэхнічныя культуры: лён, каноплі, гэта значыць тыя культуры, па якіх мы зьяўляемся адным з асноўных вытворцаў у СССР. Тут у нас справа вельмі кепская. Ня лепшая, а амаль горшая, чым са збожжазагатоўкамі. Напрыклад, па ільназагатоўках мы выканалі ўсяго 30 проц. сакавога пляну і 26.8 проц. нашага сустрэчнага. Такое выкананьне нікуды ня варта.

Я хачу давесьці да ведама сэсіі аб рабоце ў галіне загатовак некаторых раёнаў, каб паказаць, што там, дзе добра працуюць над ажыцьцяўленьнем гэтых важнейшых народна-гаспадарчых і палітычных задач, — справа пастаўлена добра, пляны выконваюцца і перавыконваюцца. Там-жа, дзе не клапоцяцца аб выкананьні сур'ёзьнейшых дырэктыў партыі і ўраду, справа амаль сарвана.

Напрыклад, па збожжазагатоўках Асьвейскі раён выканаў 109,2 проц. пляну, Гомельскі — 118,3 проц. Да рэчы, я павінен гамяльчан вітаць ня толькі з выкананьнем пляну збожжазагатовак, але і з пяцігадовым юбілеем злучэньня Гомельшчыны да БССР. Тут гамяльчане апынуліся на вышыні і паказалі іншым раёнам Беларусі, як трэба па-бальшавіцку змагацца за выкананьне важнейшых задач, якія ставіць перад намі партыя.

Сураскі раён выканаў плян збожжазагатовак на 148,8 проц.

А вось раёны, якія цягнуцца ў абозе: Лельчыцкі — па збожжазагатоўках выканаў плян на 34,8 проц., Старобінскі — 26,4 проц., Мазырскі — 39,9 проц.

Справа ў тым, што адны ўмеюць працаваць, а другія ня ўмеюць і, трэба думаць, ня хочуць. Некаторыя з адсталых раёнаў прабавалі нам даказаць, што ў іх дрэнны ўраджай і збыта перапавялічаны пляны. Мы праверылі некаторыя такія дутыя збожжафуражныя балянсы. Аказваецца, справа не ў неўраджаі, а ў дрэннай арганізацыі працы, у наяўнасьці буржуазных тэндэнцый у загатоўчых і гаспадарчых арганізацыях гэтых раёнаў.

Па ільне Капыльскі раён выканаў 2,9 проц. заданьня, Магілеўскі — 8,4 проц., Асьвейскі — 12,5 проц. Бягомльскі — 10 проц.

А вось выкананьне пляну ільназагатовак тымі раёнамі, якія добра працуюць над ажыцьцяўленьнем гэтай задачы. Напрыклад, Крычаў ужо даў 52,2 проц., Лоеў — 51,4 проц., Гомель — 72,4 проц. Гомель і тут стаіць на вышыні. Па ільнасемі мы плян выканалі ўсяго на 63 проц., а тэрмін загатоўкі ільнасемя ўжо канчаецца.

Па загатоўцы пянькі мы вельмі адстаем. БССР выканала ўсяго на 2,7 проц. пляну.

З загатоўкай і вывазкай дроў мы ідзем недапушчальна марудымі тэмпамі. Вывазка дроў усяго складае 11,6 проц. пляну. У школах і бальніцах топяць нерэгулярна, а побач з гэтым усе нашы тэлеграфныя загады раёнам, каб узмацнілі вывазку дроў, застаюцца «гласом вопиющего в пустыне». Мы ня можам цярпець далей такога становішча.

Я заастраю ўвагу ўсіх работнікаў, усіх раённых лясных арганізацый на неабходнасьць сканцэнтраваць максымум увагі на гэту важнейшую кампанію, тым больш, што ўстанавілася санная дарога. Стрыжань пытаньня цяпер у вывазцы лесаматар'ялаў і дроў, асабліва дроў, каб не падрываць нармальную работу прамысловых прадпрыемстваў. У нас у лесе ёсьць каля 1 млн. кбм дроў. Калі-б мы змаглі цалкам вывезьці гэтыя дровы, дык у нас на 100 проц. хапіла-б апалу для забесьпячэньня ўсіх прадпрыемстваў і грамадзкіх установаў.

Як мы выканалі фінансавы плян?

На 10 сьнежня выканала ўсяго 68,3 проц. квартальнага пляну, прычым у горадзе — на 86,8 проц., а ў вёсцы—на 64,6 проц. Камісія выкананьня СНК Саюзу ў свой час адзначыла, што БССР асабліва недапушчальна адстае ў выкананьні фінпляну па вясковым сэктары і галоўным чынам па добраахвотных плацяжох. Аднак, і пасьля гэтага напамінку мы нічога не направілі справу на гэтым вучастку. Больш таго, да гэтага часу ёсьць яшчэ значнае невыкананьне абавязковых плацяжоў кулацка-заможнымі гаспадаркамі.

Сэсія павінна зьвярнуць на гэту справу асаблівую ўвагу. Мы павінны дабіцца абавязковага пералому.

Кантроль рублём усіх гаспадарчых арганізацый павінен прымусіць нас наважаць гэты рубель, клапаціцца аб яго ўстойлівасьці, а гэта магчыма толькі пры абавязковым выкананьні фінплану і асабліва пляну мабілізацыі сродкаў у вызначаных намі размерах. Апрача таго, ад таго, як мы выконваем фінансавы плян у яго прыбытковай частцы ва ўсіх галінах, залежыць рэалізацыя народна-гаспадарчага пляну.

Намі ўжываліся сёлета некаторыя фінансавыя рэпрэсіі да пасобных раёнаў, якія адставалі ў выкананьні пляну мабілізацыі сродкаў. У наступным годзе мы ад гэтай меры фінансавай рэпрэсіі ня будзем адмаўляцца.

З тых фактаў і лічбаў, якія я падаў, выразна відаць, што мы дабіліся гіганцкіх посьпехаў у трэцім рашаючым годзе пяцігодкі.

Пралетарыят узмацніў свае клясавыя пазыцыі. У той-жа час мы бачым, што на пасобных вучастках нашай работы ёсьць і значныя недахопы і нават прарывы. Аб гэтым мы павінны адкрыта заявіць для таго, каб узначаліць і ўвесь дрэннай работы на пасобных вучастках, не дапускаць іх паўтарэньня ў 1932 г.

У 1931 г. мы дабіліся значнага ўздыму ва ўсіх рашаючых галінах народнай гаспадаркі. Дзякуючы таму, што БССР у гэтым годзе вышла з вялікім прыростам супроць 1930 г., мы змаглі плян заключнага — чацьвертага году пяцігодкі пабудаваць, выходзячы з асноўнага лёзунгу — выкананьня пяцігодкі ва чатыры гады.

Запраектаваны аб'ём дае нам поўную магчымасьць ажыцьцявіць на справе гэты галоўны лёзунг.

Плян, аб якім я вам даклаў, зьяўляецца бальшавіцкім плянам. Ён намячае вялікія тэмпы работы на наступны год. Гэты плян зьяўляецца цалкам рэальным. Ён завяршае першую пяцігодку і дасьць нам магчымасьць больш узброенымі падыйсьці да ажыцьцяўленьня новай пяцігодкі. Гэты плян — асноўная праграма работы для ўсіх партыйных, савецкіх і гаспадарчых арганізацый. Яго выкананьне магчыма толькі пры ўмове, калі ўсе гаспадарчыя, партыйныя і савецкія работнікі па-сапраўднаму ўсьвядомяць сутнасьць і на справе ажыцьцявяць 6 умоў тав. Сталіна. Трэба памятаць, што сакрэт бальшавіцкай работы, сакрэт тых тэмпаў, якімі мы ідзем па шляху сацыялістычнага будаўніцтва і якія мы павінны яшчэ больш павялічыць, заключаецца ў 100 проц. ажыцьцяўленьні 6 умоў тав. Сталіна. Гэта дасьць нам магчымасьць з посьпехам скончыць пяцігодку за чатыры гады і ўступіць у новую пяцігодку з вялікімі дасягненьнямі.

Далейшая рашучая барацьба за генэральную лінію партыі, барацьба на два фронты — супроць правых і «левых» апартуністаў і прымірэнчых да іх — забясьпечыць пасьпяховае ажыцьцяўленьне народна-гаспадарчага пляну чацьвертага, заключнага году пяцігодкі.

(Апладысмэнты).

Закрылася II сэсія ЦВК БССР

Апошняе пасяджэньне

Учора ўвечары адбылося апошняе, сёмае пасяджэньне II сэсіі ЦВК БССР.

Пасьля дакладу тав. **Гніляковіча** аб важнейшых пастановах, прынятых у пэрыяд паміж сэсіямі, былі зацьверджаны гэтыя пастановы, а таксама рэзалюцыі па дакладах.

Потым з заключнай прамовай выступіў т. **Чарвякоў**, які падагуліў вынікі работы сэсіі і абвясьціў яе закрытай.

Дзеньнік сэсіі

— На вячэрнім пасяджэньні 18 сьнежня з дакладам аб арганізацыйна-гаспадарчым умацаваньні калгасаў выступіў старшыня Калгасцэнтру БССР тав. **Міцькоў**.

— На ўчарайшым ранішнім пасяджэньні адбываліся спрэчкі па дакладу тав. Міцькова.

— Паміж ранішнім і вячэрнім заключным пасяджэньнямі працавалі камісіі па выпрацоўцы праектаў рэзалюцый па дакладах.

Апошнія весткі з фронту індустрыялізацыі

„Бальшавік" высока трымае чырвоны сьцяг

За 15 дзён сьнежня чырвонасьцяжны завод «Бальшавік» выканаў 107,7 проц. праграмы. Лепшыя паказальнікі дае першы хромавы цэх, які выканаў 108,8 проц.

За трэцюю пяцідзёнку сьнежня завод «Бальшавік» выпрацаваў 104,6 проц. заданьня.

Перамога „Пралетарскага шляху"

ГОМЕЛЬ. Год назад завод «Пралетарскі шлях» перайшоў ад вытворчасьці буйных скур да выпрацоўкі аўчын. Рад цяжкасьцяй прышлося сустрэць заводу: ня было дастатковага вопыту ў вырабе аўчын, не хапала абсталяваньня. Гэтыя труднасьці пераможаны на-хаду.

Дзякуючы шырока разгорнутаму сацспаборніцтву, пад кіраўніцтвам партыйнай арганізацыі, калектыў заводу дабіўся да 13-га сьнежня выкананьня гадавай вытворчай праграмы. Зараз прыступлена да замочкі аўчын па павялічанай праграме 1932 г.

Трыкутнік:

ГАЛУШЧАНКА, ФАРБЭРАЎ і ХАЙКІН.

Перадавікі прамфінпляну

Наступныя прадпрыемствы БССР перавыканалі вытворчую праграму першай дэкады сьнежня. Пры сярэднім працэнце—33,3 проц. **Калыльскі кафляны завод** даў 38,5 проц., **гута «Пралетарый»** (Менск) — 34,6, **Магілеўская рымарная фабрыка** — 37,3, **Магілеўская кардонная** — 33,9 і нарэшце **Крычаўскі крэйдавы завод**—63,3 проц. вытворчага заданьня.

Пушчан Бярэзьнікаўскі серна-квасны завод

БЯРЭЗЬНІКІ. На Хэмбудзе 2 печы серна-кваснага заводу ўжо загружаны калчаданам. Газ пушчаны ў вежы. Пачалася вытворчасьць сернага квасу. У бліжэйшы час пачнуць працаваць усе 10 печаў і 6 вежаў заводу. (ТАСС).

Новы рэкорд бэтанаваньня

КІЧКАС. На загрудзе Днепрабуду пасьля доўгай паласы адставаньня 15-га сьнежня упяршыню перавыканаць сутачны плян бэтанаваньня. Бэтоншчыкі ўклалі 890 кбм. супроць 770 паводле заданьня. Гэта перамога зьяўляецца вынікам давядзеньня пляну да зьмен і пасобных брыгадзіраў і цалкам абвяргае апартуністычнае спасыланьне на немагчымасьць выкананьня пляну ў зімовых умовах.

БІБЛІЯГРАФІЯ *І. ШМІДТ*

Трацкісцкі кантрабандыст Валасэвіч у ролі „гісторыка"

В. ВАЛАСЭВІЧ. Курс гісторыі УсеКП(б). Выпускі III і IV 1930 г. Яго-ж. Самая кароткая гісторыя УсеКП(б). Выд. 1930 і 1931 г.г.

В. Валасэвіч выкрыты ўжо ў лісьце тав. Сталіна ў рэдакцыю часопісі «Пролетарская революция», як трацкісцкі кантрабандыст, пачынае свой трэці выпуск «Курсу гісторыі УсеКП(б)» наступнымі словамі: «З пункту гледжаньня гісторыі нашай партыі гады імпэрыялістычнай вайны характарызуюцца выхадам бальшавізму на сусьветную арэну... Бальшавізм у самым пачатку вайны рашуча падняў сьцяг паўстаньня супроць апартунізму міжнароднага» (III выпуск, ст. 7).

«Гісторык» Валасэвіч «растлумачвае», што бальшавізм стаў сусьветным зьявішчам толькі з моманту вайны, а да вайны, па думцы кампэтэнтнага ў справе фальсыфікацыі гісторыі нашай партыі Валасэвіча, бальшавізм відавочна быў толькі расійскай, «нацыянальна-абмежаванай» плыньню і ня вёў змаганьня з міжнародным апартунізмам. Гэта ганебнае скажэньне гісторыі нашай партыі ёсьць нішто іншае, як паўтарэньне старога трацкісцкага паклёпу.

Тав. Сталін ужо даволі ярка паказаў усю ілжывасьць і агіднасьць такога паклёпу.

Даволі хоць бы павярхоўна азнаёміцца з сапраўднай гісторыяй нашай партыі, каб выкрыць усё фальсыфікатарства Валасэвічаў, Слуцкіх і падобных да іх трацкісцкіх кантрабандыстаў. Уся дзейнасьць Леніна і ў расейскім і ў міжнародным рэвалюцыйным рабочым руху, уся амаль 30-ці гадовая барацьба нашай партыі дал-кам прапізана змаганьнем як з айчынным, так і міжнародным апартунізмам.

Усяго гэтага «гісторык» Валасэвіч **ня мог ня ведаць.** Вось чаму ўсе яго ілжывыя пісаньні нельга інакш расцэньваць, як заведамую хлусьню, сьвядомае імкненьне скавіць гісторыю партыі ў духу контр-рэвалюцыйнага трацкізму.

Ці трэба пасьля гэтага дзівіцца, калі і ў абодвух выданьнях сваёй «Самай кароткай гісторыі» 1930 і 1931 г. г. Валасэвіч наогул вельмі слаба асьвятляе выкрыцьцё Леніным апартунізму меншавікоў? Ці-ж трэба дзівіцца, што нават у выданьні 1931 г. (у 10-м выданьні) пасьля раду рэцэнзій Валасэвіч вельмі цьмяна гаворыць аб пісаньнях Троцкага ў пэрыяд першай рэвалюцыі, зусім не выкрываючы ўсёй іх антырэвалюцыйнай сутнасьці, не паказваючы іх поўнай сувязі з наступнымі пэрыядамі дзейнасьці контр-рэвалюцыйнага трацкізму.

Замест гэтага мы сустракаем такога роду «откровение»: **«1905 год ня даў (!) поўнай, рашаючай праверкі (!) усіх тактычных поглядаў бальшавікоў і меншавікоў»...** «Аб прычынах паражэньня рэвалюцыі — піша далей Валасэвіч — усё-ж можна было-б яшчэ спрачацца, і спрэчкі працягваліся...» (стар. 52, выд. 1930 г.).

І гэту трацкісцка - меншавіцкую контр - рэвалюцыйную бязглуздзіцу Валасэвіч адважваецца яшчэ выдаваць за гісторыю партыі»!

Таксама па-трацкісцку Валасэвіч скажае і ленінскую тэорыю імпэрыялізму. Гаворачы аб «ультраімпэрыялізьме», Валасэвіч знаходзіць, што «гэта тэорыя (ці правільней **гіпотэза**) ультраімпэрыялізму выкрывае **толькі** (!) апартуністычнае **імкненьне** яе аўтара адмахнуцца ад вострых пытаньняў сучаснасьці... Але нават да такога (?) больш чым асьцярожнага (!) вываду адносна практычнай каштоўнасьці сваёй гіпотэзы (!) — піша Валасэвіч, — Каўцкі мог прыйсьці толькі з прычыны ігнараваньня закону аб няроўнамернасьці разьвіцьця»... (III в., стар. 12).

«Гісторык» Валасэвіч знаходзіць, як бачым, у гэтай «гіпотэзе» толькі «апартуністычнае **імкненьне** яе аўтара адмахнуцца ад вострых пытаньняў сучаснасьці». Але Валасэвіч ня толькі поўзае перад Каўцкім, ён і сам фактычна ў сваёй «гісторыі» скочваецца да тэорыі ўльтраімпэрыялізму, даючы акрэсьленьне сутнасьці імпэрыялізму, якое зусім скажае ленінізм. І ў «Курсе гісторыі УсеКП(б)» (3-ці выпуск, стар. 7-16), і яшчэ больш агаленьне ў сваёй «Самай кароткай гісторыі» выд. 1930 г. (стар. 82) Валасэвіч піша: «Імянна ён (капіталізм) настолькі аграмадзіў вытворства, што яно вядзецца ўжо па **дакладным, раней выпрацаваным пляне** і абслугоўвае дзесяткі, а іншы раз і сотні мільёнаў насельніцтва. Такое **планавае** кіраўніцтва — гаворыць Валасэвіч — з цэнтру цэлымі галінамі прамысловасьці стала магчымым **толькі** з прычыны **адхіленьня канкурэнцыі** паміж прамысловымі прадпрыемствамі. Канкурэнцыя адхіліла самае сябе... Цэлыя галіны вытворства **аказаліся ў іх (г. зн. капіталістычных аб'яднаньняў. І. Ш.)** манапольным **уладаньні, якое ня ведае канкурэнцыі** (Стар. 82).

Ці-ж не падпішацца пад прыведзенай цытатай любы сацыял-фашысцкі і іншы **контр-рэвалюцыйны тэарэтык «арганізаванага капіталізму»?** ¹) Ці-ж тут «гісторык» Валасэвіч ня выступіў з абаронай тэорыі контр-рэвалюцыйнага трацкізму наконт аслабленьня няроўнамернасьці разьвіцьця ў эпоху імпэрыялізму?

Мы не гаворым ужо аб тым, што ленінізм тут самым ганебным чынам скажоны, здраджан ва ўгоду трацкізму і сацыял-фашызму. Трацкісцкаму кантрабандысту Валасэвічу няма справы да таго, як Ільліч разглядаў пытаньне аб манаполіях і канкурэнцыі. Ільліч пісаў: «Манаполія, вырастаючы са свабоднай канкурэнцыі, **ня зьнішчае яе,** а існуе над ёю і побач з ёю, параджаючы гэтым рад **асабліва вострых і буйных супярэчнасьцяй, трэнькаў, канфліктаў»** (Ленін, т. XIII, стар. 105).

Але Валасэвічу няма справы да таго, што пісаў Ленін!

У разьдзеле «Прычыны краху другога Інтэрнацыяналу» «гісторык» Валасэвіч выходзіць ня з бліскучага аналізу прычын краху II Інтэрнацыяналу, дадзенага Леніным, а з варожых бальшавізму твораў Плеханава, які, па думцы Валасэвіча, стаў апартуністам толькі з пачатку вайны.

У разьдзеле «Проблемы русской революции» (выд. III) «гісторык» Валасэвіч трактуе пытаньне аб перарастаньні буржуазна-дэмакратычнай рэвалюцыі ў пралетарскую, як тыповы трацкісцкі кантрабандыст. Пытаньне аб перарастаньні буржуазна-дэмакратычнай рэвалюцыі ў сацыялістычную было пастаўлена паводле Валасэвіча толькі ў 1917 г.

Тав. Сталін даволі ярка паказаў, як Валасэвіч фальсыфікуе тут гісторыю.

«Ленін яшчэ ў 1905 г. пісаў, што **«ад рэвалюцыі дэмакратычнай мы зараз-жа пачнем пераходзіць, і якраз у меру нашай сілы, сілы сьвядомага і арганізаванага пралетарыяту, пачнем пераходзіць да сацыялістычнай рэвалюцыі»,** што **«мы стаім за непарыўную рэвалюцыю»,** што **«мы ня спынімся на поўдарозе».** Праўда, фактаў і дакумантаў аналёгічнага парадку можна было-б знайсьці ў творах Леніна вельмі многа. Але якая справа Валасэвічам да фактаў з жыцьця і дзейнасьці Леніна? Валасэвічы пішуць для таго, каб, падфарбаваўшыся пад бальшавіцкі колер, працягнуць сваю антыленінскую прапаганду, пахлусіць на бальшавікоў і сфальсыфікаваць гісторыю бальшавіцкай партыі» (І. Сталін, «Пролетарская революция», № 6, стар. 12).

Па-трацкісцку скажае Валасэвіч ленінізм і ў пытаньні аб пабудове сацыялізму ў адной краіне. «Гісторык» Валасэвіч «даводзіць» што Ленін у 1905 г. не высоўваў праблемы будаўніцтва сацыялізму ў адной краіне. Валасэвіч па-трацкісцку скажае гісторыю партыі, супроцьстаўляючы ленінскай пастаноўцы пытаньня аб поўнай магчымасьці пабудовы сацыялізму ў адной краіне задачы сусьветнай рэвалюцыі. Фальсыфікуючы гісторыю і ўзводзячы паклёп на Леніна, Валасэвіч піша, што Леніным «пытаньне ставіцца... зусім не з пункту гледжаньня перарастаньня буржуазна-дэмакратычнай рэвалюцыі ў сацыялістычную, а разглядаецца толькі пад кутом гледжаньня ажыцьцяўленьня асноўнага бальшавіцкага лёзунгу дадзенага пэрыяду, імянна ператварэньня сусьветнай імпэрыялістычнай вайны ў сусьветную грамадзянскую. Таму тут няма і пытаньня аб магчымасьцях сацыялістычнага будаўніцтва ў нашай краіне» (Вып. III, ст. 64). Больш таго, Валасэвіч заяўляе, што «нават тады, калі гэта перарастаньне стала фактам, пытаньне аб будаўніцтве сацыялізму ў адной нашай краіне пры захаваньні капіталізму ў іншых краінах ня стала яшчэ актуальнейшым пытаньнем»... (Стар. 65).

І гэту трацкісцкую кантрабанду Валасэвіч падносіць чытачом, маскуючыся цытатамі з Леніна, «глыбокамысьленнымі» развагамі і г. д.

Ці-ж трэба дзівіцца пасьля гэтага, што ў пытаньні аб характары Кастрычніцкай рэвалюцыі Валасэвіч выступае, як вораг бальшавізму.

У кастрычніку, былі, паводле Валасэвіча, дзьве рэвалюцыі. Ён піша: «З аднаго боку ён «Кастрычніцкі пераварот») быў ужо сацыялістычным... З другога боку, ён быў яшчэ буржуазным». (IV вып., стар. 29-30). А далей Валасэвіч проста адмаўляе сацыялістычны характар Кастрычніцкай рэвалюцыі. «І так, **Кастрычніцкі пераварот — піша Валасэвіч — насіў буржуазны характар ня толькі ў тым сэнсе**, што ён давяршаў буржуазна-дэмакратычную рэвалюцыю, **але і па сваіх рухаючых сілах».** (Стар. 30).

У сувязі з гэтым робіцца зразумелым, чаму Валасэвіч адмаўляе і расслаеньне сялянства ў пэрыяд Кастрычніка. Усё сялянства ў цэлым у яго зьяўляецца рухаючай сілай Кастрычніцкага перавароту.

Валасэвіч цалкам рэстаўруе тут «каменоўшчыну», двурушніцкі скажаючы пры гэтым Леніна і Сталіна.

IV вып. Валасэвіч заканчвае наступным контр-рэвалюцыйным палажэньнем: «Дарабіць тое, чаго капіталізм не пасьпеў зрабіць... — вось якая задача была пастаўлена перад пралетарскай уладай... Геніяльнейшым вырашэньнем гэтай праблемы і зьявіўся НЭП».

Кніжка Валасэвіча прадстаўляе суцэльную агідную трацкісцкую кантрабанду.

Разабраць у межах газэтнай рэцэнзіі ўсе «откровения» «гісторыка» Валасэвіча няма магчымасьці. Выклікае глыбокае абурэньне тое, што гэта кантрабанда выпускаецца дзесяткамі выданьнем. Выдавецтва «Прыбой» дапамагло Валасэвічу распаўсюдзіць контр - рэвалюцыйную, трацкісцкую хлусьню на партыю, на ленінізм.

Дапамаглі Валасэвічу і некаторыя рэцэнзэнты, якія не далі належнага адпору «працам» Валасэвіча. У прыватнасьці тав. К. Сідараў у рэцэнзіі пад загалоўкам «Самае кароткае ляніна быць яшчэ самым вытрыманым», адзначаючы рад буйнейшых прынцыповых памылак у кнігах Валасэвіча, у той-жа час піша, што «станоўчай рысай выпускаў зьяўляецца навуковая, так сказаць, угрунтаванасьць палажэньняў, аднак і г. д., якая апіраецца на шырокую гісторыка-партыйную літаратуру. Аўтар (г. зн. Валасэвіч. І. Ш.) ва ўсім працягу выпускаў трымаецца прынцыпу нічога лішняга, але нічога галаслоўнага». (Часопісь «Ком. революция», № 5-6, 1931 год) Хоць т. Сідараў і прапануе падручнік грунтоўна перапрацаваць, але ўся ацэнка тав. Сідарава, які ня даў належнага бязьлітаснага выкрыцьця контр-рэвалюцыйнай трацкісцкай сутнасьці выпускаў «История ВКП(б)» Валасэвіча і яго «Самой короткой истории», льле ваду на млын трацкісцкіх кантрабандыстаў.

(«Правда»).

---

¹) Не выпадкова, што вельмі пахвальны водгук аб «Гісторыі» Валасэвіча даў вядомы правы апартуніст А. Сьляпкоў, які адзначае ў сваёй рэцэнзіі «вельмі цяжкую» і «здавальняюча» выкананую Валасэвічам задачу. «Выкладаньне вельмі ясна, простае, жывое. Брашура належыць да ліку надрэнных папулярных дапаможнікаў» — **вось як хваліў Валасэвіча Сьляпкоў!**

ЗАЎВАГА РЭДАКЦЫІ: Гэта рэцэнзія, апублікаваная ў «Праўдзе», цалкам адносіцца і да беларускага выданьня «Самай кароткай гісторыі УсеКП(б)» Валасэвіча—выд. БДВ 1931 г.

Палітычным рэдактарам, які адказвае за выхад гэтай кантрабандысцкай трацкісцкай кніжкі, зьяўляецца Ш. БУДЗІН.

Нельга прайсьці міма зусім недапушчальных адносін перткалектыву 1-й друкарні, праяўленых ёю ў часе абгаварэньня ліста тав. Сталіна. Абмяркоўваючы ліст, калектыў умудрыўся не заўважыць гэтай буйнейшай палітычнай памылкі выдавецтва і не прыцягнуць да адказнасьці Будзіна.

АПАРАТ СЬМЕРЦІ „ДЗЕЙНІЧАЕ“

Дзясяткі земляробчых рабочых Зах. Украіны адданы пад ваенна-палявы суд

Няма таго дня, каб фашысцкая прэса ня пісала аб масавых арыштах рэвалюцыйных рабочых і сялян і аддачы іх пад ваенна-палявы суд. Крывавая машына фашысцкага правасудзьдзя дзейнічае бесьперабойна. Прыгаворы кары сьмерцю сыплюцца, як «з рога изобилия». На працягу толькі апошніх двух тыдняў дзесяткі рэвалюцыйных рабочых і сялян загінулі на шыбеніцы.

Зараз намі атрыманы весткі аб падрыхтоўцы масавай крывавай расправы над земляробчымі рабочымі ў Заходняй Украіне. У лістападзе бягучага году ў Тарнопальскай акрузе праведзены былі масавыя арышты сярод украінцаў. У вёсках ДЫЧКАВЕ, КРАСАЎЦЫ і ТОЎСТАЛУГУ было арыштавана 14 земляробчых рабочых па абвінавачаньні ў прыналежнасьці да тайнай украінскай вайсковай арганізацыі. УСЕ 12 ЧАЛАВЕК АДДАНЫ ПАД ВАЕННА-ПАЛЯВЫ СУД І ІМ ПАГРАЖАЕ КАРА СЬМЕРЦЮ.

Апрача гэтага ў тэй-жа Тарнопальскай акрузе ў раёне Мікуміч восеньню было арыштавана 12 асоб — членаў легальнай рэвалюцыйнай арганізацыі земляробчых рабочых «Сельроб». Усе арыштаваныя рабочыя таксама АДДАНЫ ПАД ВАЕННА-ПАЛЯВЫ СУД па абвінавачваньні ў «дзяржаўнай здрадзе». ІМ ПАГРАЖАЕ КАРА СЬМЕРЦЮ.

Галадоўкі палітзьняволеных у польскіх турмах

ВАРШАВА, 19. Пахол фашысцкай дыктатуры супроць лепшых прадстаўнікоў рабочай клясы і працоўнага сялянства, заключаных у засьценках беларускай Польшчы, ніколі ня спыняўся. На працягу ўжо каля двух год палітзьняволеныя фашысцкай Польшчы вядуць барацьбу не на жыцьцё, а на сьмерць супроць увядзеньня фашысцка-паліцэйскага турэмнага рэгляманту, за мінімальныя чалавечыя правы. Пасьля хвалі галадовак летам і восеньню бягучага году, пасьля ўсеагульнай галадоўкі палітзьняволеных ва ўсёй Польшчы, барацьба палітзьняволеных за свае правы ў камерных мяшкох зараз зноў абвастраецца.

Намі атрыманы весткі аб галадоўцы **палітзьняволеных у Мысловіцкай турме** (Верхняя Сілезія), у часе якое **быў задушан палітзьняволены 24-гадовы Якубовіч**. Пасьля галадоўкі палітзьняволеных пазбавілі наўгачніх прагулкі, сьвятла, гарачай вады, была ліквідавана бібліятэка, забаронены кнігі, газэты. Пры перавозцы з адной турмы ў другую палітзьняволеных закоўваюць у ланцугі. **Біцьцё зьяўляецца штодзенным зьявішчам.**

У Кракаўскай турме адбылася галадоўка 16 палітзьняволеных жанчын. Галадоўка выбухнула ў знак пратэсту супроць увядзеньня новага фашысцкага турэмнага рэгляманту. У першы-ж дзень галадоўкі ў камэры да галадаючых **ўварвалася зграя турэмных наглядальнікаў, якая страшэнна скатавала жанчын. Пасьля галадаючыя былі кінуты ў цёмны карцэр, у якім яны таксама падпалі катаваньню.**

Калі скончылася галадоўка, супроць жанчын турэмнай адміністрацыяй была ўзбуджана новая судовая справа па абвінавачаньні ў бунце. За галадоўку жанчыны былі пазбаўлены на месяц харчовых пасылак ад сваякоў, спатканьняў, лістоў, кніг і газэт. Апрача таго, на працягу месяца палітзьняволеныя жанчыны былі пазбаўлены сяньнікоў і ім прышлося спаць на голых жалезных ложках.

У Пінскай турме катаваньні 27 палітзьняволеных ня спыняюцца. Усе палітзьняволеныя пераведзены на крымінальныя ўмовы. Адміністрацыя падкупляе крымінальных гаротнікаў каўбасой і папяросамі і нацкоўвае іх на палітычных. Таму розныя бандыты крывава распраўляюцца з нашымі таварышамі. У апошнія часы начальнік турмы, вядомы садыст Копец ходзіць у дэфэнзыву і ўказвае, каго трэба «вучыць», г. зн. катаваць. Начамі ўрываюцца ў камэру сышчыкі, выцягваюць палітычных зьняволеных у карцэр і там зьбіваюць да страты прытомнасьці.

Такія-ж весткі аб масавым катаваньні палітычных зьняволеных ідуць з Дарагабыцкай, Гарадзенскай, Беластоцкай турмаў і інш.

Катарга за „справу“ з 1918 году

ВАРШАВА, 16. Акруговы суд у Роўні (Зах. Украіна) прыгаварыў двох рабочых, абвінавачаных у арганізацыі ў 1918 годзе «дывэрсыйнага» атраду, на 15 год катаргі кожнага.

У Вадовіцах (Кракаўскае ваяводзтва) за арганізацыю ў маі г. г. дэманстрацыі беспрацоўных у Бельску 6 рэвалюцыйных рабочых прыгаворана ад 1 да 5 год катаргі.

Забіт камуніст Кохан

ВАРШАВА, 16. У Варшаве раніцой 13 сьнежня забіт **камуніст Кохан**. Як паведамляе «Ілюстраваны Кур'ер Цодзенны», ён вывешваў на тэлеграфных правадох чырвоны транспарант з камуністычнымі лёзунгамі. Калі агент дэфэнзывы хацеў арыштаваць Кохана, апошні пачаў уцякаць. Шпік стрэліў з рэвальвэру, забіўшы Кохана на месцы. Тав. Кохан — малады рабочы, яму было толькі 23 гады.

Сярод рабочых Варшавы — глыбокае абурэньне.

Помста за зьдзекі, за эксплёатацыю

ВІЛЬНЯ, 16. Учарайшае «Слово» зьмясьціла падрабязнасьці замаху на старшыню аб'яднаньня «крэсавых» памешчыкаў-зуброў — графа Юндзіла.

Паводле інфармацыі «Слова», замах зрабіла дружына самаабароны адной з навакольных вёсак, супольна з батракамі. Калі памешчык знаходзіўся ў сваім габінэце, праз вакно ў яго стрэлілі з трох вінтовак адразу. Цяжка паранены Юндзіла быў зараз-жа адвезен у найлепшую бальніцу Варшавы, дзе знаходзіцца да гэтага часу.

Прычыны замаху, як зазначае «Слово», — «выключна палітычныя». Батракі і сялянства, якіх памешчык бязьлітасна эксплёатаваў і рабаваў, выказалі сваю клясавую нянавісьць і помсту, страляючы ў вядомага рэакцыянэра і ката Заходняй Беларусі.

Ня гледзячы на тое, што ва ўсім Косаўскім павеце праведзены масавыя арышты, што па навакольных вёсках гарцуюць карныя экспэдыцыі, — «Слово» са сьціснутымі ад злосьці зубамі паведамляе, што вінаватых арыштаваць не ўдалося.

Белагвардзейскія шпіёны пад апекай францускага ўраду

ПАРЫЖ, 17. Міністар працы Ландры, які выступіў у палаце дэпутатаў у спрэчках па законапраекце аб абмежаваньні працы замежных рабочых, заявіў, што ўрад прыняў рад мер па скарачэньні ліку замежных рабочых і па абмежаваньні іх уезду ва Францыю. Побач з тым Ландры адзначыў, што ўрад лічыць неабходным зрабіць выключэньне для некаторых катэгорый замежных рабочых, а імена: 1) для выконваючых работы, «якімі не жадаюць займацца францускія рабочыя» і 2) «палітычныя эмігранты», якіх «паводле маральных меркаваньняў нельга выслаць на бацькаўшчыну».

Камдэпутат Богран, які выступіў у спрэчках, выкрыў гэтыя трук Ландры. «Францускі ўрад,—заявіў ён,—ня думае зусім высылаць з Францыі чужаземцаў, але якіх? Ён бярэ пад сваю абарону **італьянскіх фашыстаў і расійскіх белагвардзейцаў**, якія **іграюць на заводах ролю агентаў прадпрымцаў і карыстаюцца правам скліканьня сходаў і палітычнай прапаганды**, у той час, як замежных рэвалюцыйных рабочых за адно толькі выступленьне ў абарону сваіх кроўных інтарэсаў высылаюць з Францыі.

Другое выключэньне,—заявіў Богран,—«францускі ўрад робіць у інтарэсах прамыслоўцы для групы замежных рабочых, законтрактаваных так званай «эміграцыйнай грамадой», на такіх кабальных умовах, што грамада гэта зусім заслугоўвае назвы «**грамады гандлю белымі рабамі**». «На зямной кулі зараз ёсьць 50 мільёнаў беспрацоўных—гаворыць тав. Богран.—120 млн. мужчын, жанчын і дзяцей галадаюць. Нельга пры такіх умовах падзяляць рабочых на замежных і мясцовых. Працоўныя масы ўсяго сьвету павінны аб'яднацца пад сьцягамі Камінтэрну і стварыць адзіны фронт супроць агульнага ворага—капіталу». (ТАСС).

На юбілеі Андрэя Александровіча

За Магнітабуды ў літаратуры—у бой грамадой штурмавой бальшавіцкай!

Андрэй Александровіч прыйшоў да свайго 10-гадовага юбілею творчай, паэтычнай работы праз **актыўную грамадзкую і партыйную работу**. Шлях, па якім паэт ішоў, на якім рос і разьвіваўся—шлях непасрэднага ўдзельніка ў сацыялістычным будаўніцтве, шлях **байца** ў абвостраным клясавым змаганьні.

Андрэй Александровіч нарадзіўся ў 1906 годзе, у Менску, у сям'і шаўца. З малых год ён акунаецца ў грамадзкую працу. У 1923 годзе, будучы ўжо камсамольцам, Александровіч прымае ўдзел у арганізацыі першага ў БССР літаратурнага аб'яднаньня «**Маладняк**».

Пазьней Александровіч працаваў рэдактарам камсамольскай часопісі «**Малады Араты**», рэдактарам газэты «**Наш працаўнік**» (Калінінічына), часопісі «**Бальшавік Беларусі**», намесьнікам дырэктара Белдзяржкіно і г. д.

Вучыўся ў Менскім пэдтэхнікуме і Белдзяржуніварсытэце. Зьяўляецца членам КП(б)Б і на апошнім Усебеларускім зьезьдзе саветаў выбран у **члены ЦВК БССР**.

Александровіч зьяўляецца адным з кіраўнікоў беларускай пралетарскай літаратуры, членам сакратарыяту БелАПП'у і адказным сакратаром МенАПП'у.

Усьведамляючы ўсю веліч ролі мастацкай пралетарскай літаратуры, як часткі баявога бальшавіцкага друку **—вострай зброі ў руках партыі па будаўніцтве сацыялізму**, Андрэй Александровіч дае наступную, правільную і заслужаную ацэнку сваім творам:

Поступу
Слаўнае
Перабудовы
Служыць
Маё
Бальшавіцкае
Слова.

Мастацкае бальшавіцкае слова пралетарскага пісьменьніка Александровіча сапраўды служыць сацыялістычнаму будаўніцтву, дапамагае партыі мабілізоўваць шырокія працоўныя масы, камуністычна выхоўваць іх, арганізоўваць волю і пачуцьці для яшчэ больш актыўнай, баявой і ўдарнай работы па выкананьні пяцігодкі за чатыры гады.

Для сваёй творчасьці Андрэй Александровіч бярэ матар'ял з практыкі **сацыялістычнага будаўніцтва**. Тэматыка яго вершаў, паэм і песень — абумоўліваецца тымі гістарычнымі задачамі, якія вырашае пралетарыят.

І ў гэтым сіла пралетарскага паэта Андрэя Александровіча. У гэтым яго заслуга перад рабочай клясай Савецкай Беларусі, як аднаго з лепшых ударнікаў па фронце стварэньня вялікага бальшавіцкага мастацтва.

**

18 сьнежня ў Дзяржаўным тэатры адбыўся шырокі вечар, прысьвечаны 10-гадовай літаратурнай творчай рабоце Андрэя Александровіча. Вечар адкрыў уступнаю прамовою наркамасьветы тав. **Платун**.

На юбілеі Александровіча прысутнічалі і пад дружныя воплескі былі запрошаны ў прэзыдыум сакратары **ЦК КП(б)Б тав. Гей і тав. Шаранговіч, старшыня СНК тав. Галадзед, Чарнушэвіч, Грыцэвіч і інш.**

Ад ЦК КП(б)Б перадаў прывітаньне юбіляру загадчык Культпропу ЦК тав. **Чарнушэвіч**.

Тав. Чарнушэвіч у сваёй прамове адзначае заслугі Андрэя Александровіча, які сваёй творчасьцю, сваім мастацкім словам **дапамагаў і дапамагае партыі будаваць сацыялізм**, выкрываць клясавых ворагаў, змагацца з імі. Таксама тав. Чарнушэвіч ставіць цэлы рад найбольш актуальных задач, якія высунуты партыяй перад пралетарскай літаратурай.

Даклад аб творчым росьце Андрэя Александровіча зрабіў тав. Бэндэ.

З глыбокай уважлівасьцю было выслухана выступленьне тав. **Галадзеда**, які перадаў цёплае шчырае прывітаньне Андрэю Александровічу, а праз урачыстасьць, прысьвечаную юбілею паэты — і ўсім пралетарскім пісьменьнікам і паэтам.

Тав. Галадзед кажа, што ён сваё пісьмовае прывітаньне адрасаваў Александровічу, як аўтару «**Цені на сонцы**». Гэта тав. Галадзед тлумачыць тым, што ў сваёй паэме «Цені на сонцы» Андрэй Александровіч выявіў вялікую **клясавую пільнасьць** да ворагаў пралетарскай дыктатуры — беларускага контр-рэвалюцыйнага нацдэмізму, выкрываючы яго канкрэтных посьбітаў, забіваючы вострыя цьвік у розных Цьвікевічаў і Лёсікаў. Александровіч у гэтай паэме паказаў высокі ўзровень аўладаньня сьветапоглядам пралетарыяту, бачыць і правільна разумее патэнцыю разьвіцьця і будаўніцтва пралетарскай краіны.

Тав. Галадзед жадае Александровічу яшчэ шмат дзесяцігодак працаваць на карысьць пралетарскай краіны, даваць высока-мастацкія творы, вартыя нашага герайчнага часу.

Юбіляра яшчэ віталі: сакратар ЦК ЛКСМБ тав. **Палякоў; Міхась Лынькоў** — ад БелАПП'у, **Сянкевіч** — ад прэзыдыуму Беларускай Акадэміі Навук і ад ФАСП, **Клімковіч**—ад прафсаюзаў Беларусі, Харык і Браніштэйн—ад яўсэкцыі БелАПП'у і інш.

Запісаны ў літаратуру ўдарнік заводу імя Варашылава тав. **Нортман** вітаў Александровіча вершам, прысьвечаным юбіляру.

На імя юбіляра атрымана тэлеграма ад Наркамасьветы Украіны і шмат прывітаньняў і тэлеграм ад іншых культурных і мастацкіх устаноў БССР.

Адказнае слова юбіляра сустракаецца шумнымі працяжнымі воплескамі. Андрэй Александровіч лічыць свой дзесяцігадовы шлях, сваю першую дзесяцігодку, **як этап ідэалягічнага фармаваньня і творчага росту пад кіраўніцтвам партыі**. Андрэй канчае сваю прамову такімі словамі:

— Для выкананьня тых велізарных задач, якія ставіць перад намі партыя—

Рушымся біцца
У бой
Грамадой
Штурмавой
Бальшавіцкай!

**

Сваімі паэмамі **«Цені на сонцы» і «Паэмай пра ворага»** Андрэй Александровіч выкрыў і абвясьціў сьмяротны прысуд агентам фашысцкай Польшчы — беларускім нацыянал-дэмакратам.—

Маскі далоў!
Рэвалюцыі суд
Бязьлітасны і
Канчатковы.

У сваіх апошніх новых творах — «Паэма імя вызваленьня», п'еса «Напор», якая ў бліжэйшыя дні пойдзе прэм'ерай у БДТ2 і якая перапрацоўваецца аўтарам у лібрэта для першай арыгінальнай беларускай пралетарскай опэры, у радзе іншых новых вершаў Андрэй Александровіч яшчэ больш актывізуе свой ўдзел у сацыялістычным будаўніцтве, сапраўды з вялікаю сілаю мастацкага слова служыць вялікай сацыялістычнай перабудове.

Андрэй Александровіч ідзе па лініі напружанай работы над **завострэнай палітычнай насычанасьцю** сваіх твораў, над **мастацкай якасьцю** сваёй прадукцыі.

Перад Андрэем Александровічам, як і перад усёй пралетарскай літаратурай БССР, стаяць велізарныя задачы, пастаўленыя партыяй — **даць Магнітабуды ў літаратуры**.

Гэта задача, пад кіраўніцтвам партыі, пралетарскай літаратурай будзе выканана.

Францускія войскі ўварваліся ў паўднёвы Кітай

НОВЫЯ ЭШАЛЁНЫ „ГАРМАТНАГА МЯСА“ ПАСЫЛАЮЦЦА Ў МАНЧЖУРЫЮ

Францускія войскі перайшлі кітайскую граніцу ў Гуансі

ТОКІЕ, 17. З Кантону паведамляюць, што францускія войскі ў Інда-Кітаі перайшлі граніцу правінцыі Гуансі пад прадлогам прасьледваньня «бандытаў» і камуністаў. У сувязі з гэтым паведамляюць, што кантонскі ўрад быццам-бы мяркуе пратэставаць. Яўгені Чэн рыхтуе пратэст францускаму пасланьніку Вільсэну. Паведамляюць, што кантонскі ўрад адначасова прапанаваў Лі Цун-жэню (галоўнакамандуючы войскамі Гуансійскай правінцыі) узмацніць пагранічную ахову Гуансі і аказаць супраціўленьне францускім войскам. (ТАСС).

Японія пасылае новыя часьці ў Манчжурыю

ТОКІЕ, 17. Як толькі скончылася пасяджэньне рады міністраў, якое адбылося сёньня, ваенны міністар апублікаваў паведамленьне аб тым, што «прынята рашэньне паслаць у Манчжурыю папаўненьне ў складзе брыгады, якая выдзелена 19-ай дывізіяй, а таксама атрадаў, якія выдзелены 1-й і 12-й дывізіямі». Адпраўка брыгад у Манчжурыю матывуецца «халадамі ў Манчжурыі», узмацненьнем «бандытызму», а таксама «неабходнасьцю вярнуць брыгады карэйскіх войск у Карэю, лічачыся з патрабаваньнямі абароны Карэі». Лік брыгады, якая пасылаецца 10-й дывізіяй, паводле паведамленьня міністэрства ваенных спраў, раўняецца карэйскай брыгадзе, прычым указваецца, што «карэйская брыгада будзе вернута ва Карэю, калі будзе зноўдзена магчымым».

Патрабаваньне ачысьціць Цзіньчжоу

ТОКІЕ, 18. Паводле паведамленьня агенцтва Сімбун Рэнга, японская ваенная ўлада ў адпаведнасьці з ухваленай пастановай «пакончыць з бандытамі» ў раёне Цзіньчжоу прапанавала камандуючаму японскай акупацыйнай арміяй Хондзіё прыняць належныя меры. Мяркуюць, што Хондзіё прадставіць Чжан Сюэ-ляну 10-цідзенны тэрмін для эвакуацыі Цзіньчжоу. Ваенныя дзеяньні пачнуцца безадкладна пасьля гэтага тэрміну. Дан загад аб мабілізацыі часьцей 5-й дывізіі японскіх войск у гор. Хірошыма і адпраўцы іх у Манчжурыю.

**

ТОКІЕ, 18. Японскае ваеннае міністэрства апублікавала паведамленьне, у якім гаворыцца аб рашэньні «пакончыць з бандытамі» ў раёнах на захад ад ракі Ляо. Не падлягае сумненьню, што ў даным выпадку гутарка ідзе аб падыходзячых апэрацыях супроць Цзіньчжоу. Перш за ўсё будзе перададзены ультыматум Чжан Сюэ-ляну аб вывадзе японскіх войск з Цзіньчжоу ў 10-цідзенны тэрмін.

Разгром памяшканьня Гаміндану ў Шанхаі

ШАНХАЙ, 18. Як паведамляюць з Нанкіну, **3.000 студэнтаў атакавалі памяшканьне цэнтральных органаў Гаміндану.** З праклёнамі па адрасе Гаміндану студэнты падыйшлі да яго будынку. Студэнты пачалі зьнішчаць усю абстаноўку ў памяшканьні Гаміндану. Атрад салдат мясцовага гарнізону разагнаў студэнтаў. Аднак, праз некаторы час студэнты зноў сабраліся ля будынку рэдакцыі афіцыяльнага органу нанкінскага ўраду «Дэйлі Ньюс». Ня гледзячы на супраціўленьне, аказанае служачымі рэдакцыі, **студэнты разграмілі некалькі рэдакцыйных габінэтаў і папсавалі друкарскія машыны.** Паліцыя і салдаты адкрылі агонь. На месца сутычкі прыбылі 5 бронямашын з войскамі. (ТАСС).

Рэарганізацыя штабу акупацыйнай арміі

ТОКІЕ, 19. З Мукдэну паведамляюць аб праведзенай даўно чаканай рэарганізацыі штабу квантунскай арміі. У штабе створаны наступныя новыя аддзелы: адміністрацыйны, фінансавы, шляхоў зносін, асьветы, калянізацыі, замежных спраў. Аб функцыях новых аддзелаў нічога не гаворыцца, указваецца толькі, што рэарганізацыя праведзена з мэтай лепш справіцца са становішчам, якое стварылася ў рэзультаце манчжурскага інцыдэнту. (ТАСС).

Назначэньне японскага прынца начальнікам генштабу

ТОКІЕ, 18. Газэты ўказваюць, што перагаворы аб назначэньні прынца Каніна начальнікам генэральнага штабу японскай арміі закончыліся з посьпехам. Газэты адзначаюць надзвычайнасьць гэтага назначэньня, напамінаючы, **што ў гісторыі Японіі толькі ў часе расійска-японскай вайны начальнікам штаба назначаўся прынц.**

Захват кітайскай тэрыторыі—„нармальныя армейскія манэўры“

ШАНХАЙ, 18. У той час, як генэрал-губарнатар Інда-Кітаю катэгарычна адмаўляе факт уступленьня францускіх каляніяльных войск у правінцыю Гуансі, францускі пасланік у Кітаі заявіў, **што ваенныя дзеяньні ў гэтым раёне зьяўляюцца «нармальнымі армейскімі манэўрамі».** Такім чынам, францускі пасланік не абвяргае факту заняцьця некаторых пунктаў Гуансі францускімі войскамі.

У кітайскіх колах аднесьліся з вялікім недавер'ем да абвяржэньняў Інда-Кітаю, асабліва пасьля таго, як зьявіліся паведамленьні з Японіі аб сакрэтнай умове паміж Францыяй і Японіяй, паводле якое Японія гарантуе Францыі права захвату некаторых кітайскіх правінцый. (ТАСС).

Магутныя дэманстрацыі беспрацоўных па ўсёй Англіі

ЛЕНДАН. Паводле паведамленьня органу кампартыі «Дэйлі Уоркер», па ўсёй краіне адбываюцца магутныя дэманстрацыі беспрацоўных у знак пратэсту супроць «праверкі патрэбнасьцяй». У Кіркхальдзе (Шатляндыя) 6.000 беспрацоўных наладзілі дэманстрацыю перад муніцыпальнай радай, патрабуючы скасаваньня «праверкі патрэбнасьцяй». Ва Уігене на некалькі тысяч беспрацоўных, якія дэманстравалі супроць «праверкі патрэбнасьцяй», напала паліцыя. Сярод дэманстрантаў шмат параненых. Трое арыштаваны. Камітэт, які выдае дапамогу ва Уігене, прымушан быў зьвярнуцца да ўрад з прапановай спыніць «праверку патрэбнасьцяй». Дэманстрацыя беспрацоўных адбылася таксама ў Кілмбэнку (Шатляндыя). У радзе раёнаў адбываліся канфэрэнцыі беспрацоўных і занятых на вытворчасьці рабочых. На канфэрэнцыях абмяркоўвалася пытаньне аб барацьбе беспрацоўных супроць наступленьня на іх жыцьцёвы ўзровень. У Стоку (цэнтр фарфаравай прамысловасьці) 2.000 беспрацоўных дэманстрантаў прабавалі прабрацца ў будынак муніцыпалітэту з мэтаю пратэставаць супроць «праверкі патрэбнасьцяй». Паліцыя напала на беспрацоўных, якія ў адказ пачалі кідаць у паліцэйскіх цаглінамі і бутэлькамі. 12 беспрацоўных паранена, двое арыштавана. Пасьля сутычкі муніцыпальная рада папрасіла спыніць «праверку патрэбнасьцяй» да перагляду гэтага пытаньня ўрадам. Дэргемскія шахцёры склікаюць канфэрэнцыю для абгаварэньня пытаньня аб стварэньні адзінага фронту беспрацоўных і занятых рабочых для барацьбы супроць «праверкі патрэбнасьцяй» (ТАСС).

Паведамленьні

— ПТ ЦКК КП(б)Б выклікае на сваё пасяджэньне—22-XII-31 г., у 6 гадз вечара па разгляду партспраў наступных таварышоў: Ачычынікава Фёдара Аляксеева, Гелера Саламона Барысава, Красоўскага Паўла Ісакавіча, Фабрыкантава Ісака Самуілава, Мяцельскага Алеся Андрэева, Дзямідава Паўла Андрэевіча, Малошанка С. Я., Кузьняцова Міколу Ігнатава, Кісялёва Пракопа Мікітава, Акульчыка Канстанціна Антонавіча, Шмулевіча Якава Мэерава, Мархасева Залмана Рувімава, Курылла Якуба Сідарава, Матусевіча Рыгора Карлава, Кабак Сьцяпана Васільева, Макара Адольфа Міхасева, Агляшэвіча Пётру Канстанцінава, Ігнатава Фёдара Пятровіча, Мясінскага Івана Іванавіча, Шапіра Х. В. (Камвуз), Соскіна Ошэра Бэркавіча, Лапухіна Ляпона Карпавіча, Іваша Алеся Лукашова, Манулла Мар'ю Адамаўну, Тышкевіча Ісака Васілева, Данчанка Міхася Янкава, Сабінаву Надзею Сямёнаву, Назаранка Т. А., Шумскага Н. А., Катковіча В. Ф., Крайніка І., Агейчыка Д. Е., Рогаў-Брукер А. П.

Адказны рэдактар М. ГАРЫН.

Выдавецтва ЦК КП(б)Б „ЗЬВЯЗДА“

ПАДПІСВАЙЦЕСЯ СВАЯЧАСОВА на 1932 год

НА ГАЗЭТЫ	Перыядычнасьць	На 1 м.	На 3 м.	На 6 м.	На год
ЗЬВЯЗДА орган ЦК КП(б)Б	штодзенна	1—	3—	6—	12—
РАБСЕЛЬКОР орган Культпр. ЦК КП(б)Б Выданьне газ. „Зьвязда“	Раз у пяцідзеньку	—20	—60	1.20	2.40
ОРКА (На польскай мове) Орган ЦК КП(б)Б	2 разы ў пяцідзеньку	—25	—75	1.50	3—
РАЎДАНАІС АРТОЯС (На літоўскай мове) Выдан. ЦК КП(б)Б	Раз у пяцідзеньку	—	—45	—90	1.80
НА ЧАСОПІСІ:					
Бальшавік Беларусі Орган ЦК КП(б)Б	2 разы ў месяц	—40	1.20	2.40	4.80
Работніца і калгасьніца Беларусі Выданьне ЦК КП(б)Б	3 разы ў месяц	—20	—60	1.20	2.40

Падпіска прымаецца: на пошце, лістаносцамі і ўпаўнаважанымі па друку ва ўсіх прадпрыемствах і ўстановах БССР.

„Чырвоная зорка“ Пач.: 6; 7-30, 9 і 10-30.	Гукавы гаворачы фільм ШТОРМ гукавы фільм „Пасіфік“.
„Культура“ Пач.: 7, 8-45, 10-30	Мастацкі ўсходні фільм АНУШ Звыш праграмы: Лодырам конец
ПРАЛЕТАРЫ Апкр. з 12 г. дня	Эма Цэсарская у маст. фільме ДЗЬВЕ МАТКІ драма ў 5 ч. Звыш прагр.—хроніка Саюзкіно.
Інтэрнацыянал Апкр. з 12 г. дня.	Элен Рыхтэр у камэдыі МАРАЛЬ. Звыш прагр. кіно-хроніка Саюзкіно
„Юны Піянэр“ (будынак кіно „Культура“)	Мастацкі фільм СЫГНАЛ у 7 част. Звыш прагр.—хроніка. Пач. 1 г.-2-30. Каса—за 11 г. ран.
„СПАРТАК“ Пач. 7, 9 і 11 Каса—ад 5 гадз.	Сёньня [illegible] фільм „Коллежский регистратор“ У гал. ролі вядомы артыст Масквін.

ДОМ АСЬВЕТЫ (Камуністычная, 19). Сёньня, 20-XII-31 г., у 7 гадзін вечара адбудзецца АДКРЫЦЬЦЁ IX-га УСЕБЕЛАРУСКАГА ЗЬЕЗДУ САЮЗУ ПРАЦАСЬВЕТЫ.

Парадак дня:
1. Даклад ЦК саюзу працасьветы.
2. Справаздача ЦП саюзу Беларусі працасьветы і рэўкамісіі ЦП.
3. Даклады Наркамасьветы:
а) аб прагр. маст. і арганізацыі метадычнага кіраўніцтва,
б) аб пэдагагічных кадрах,
в) аб школьным будаўніцтве.
4. Выбары.

Фракцыя зьезду роўна ў 6 гадзін вечара 20 сьнежня г.г. тэм-жа.

Аргкамісія.

Пашыранае пасяджэньне прэзыдыуму ЦК МОПР'у БССР

АДБУДЗЕЦЦА

20 сьнежня, у 7 гадз. вечара, у памяшканьні ЦК.

Парадак дня: 1. Інфармацыя з месц аб ходзе рэалізацыі пазыкі і ўдарнага месячніка.
Дакладваюць: Бабруйск, Рэчыца, Чэрвень, Хойнікі, Слуцак, Жыткавічы, Петрыкаў, Заслаўе.
2. Справаздача заўкому МОПР'у зав. „Полымя Рэвалюцыі“ (Менск), Дрэваапрацоўчага камбінату (Бабруйск) аб масавай рабоце сярод рабочых.
3. Даклады 2-х вайсковых арганізацый МОПР'у Менску і Бабруйску і судаклад Бабруйскага РК МОПР'у аб рабоце сярод Чырвонай арміі.
4. Аб 4-м пленуме ЦК.
5. Даклад рэдкалегіі газэты „МОПР“.

Яўка ўсіх членаў і кандыдатаў прэзыдыуму і ЦК МОПР'у, якія знаходзяцца ў Менску—абавязкова.
Запрашаецца гарадзкі актыў.

Сакратар ЦК МОПР'у БССР Цудзін.

Мікрабіялягічны інстытут просіць медпрацаўнікоў, у якіх на руках ёсьць КНІГІ, якія належаць бібліятэцы мікрабіялягічнага інстытуту, у 3-дзённы тэрмін, у сувязі з пераўлікам, здаць інстытуту. У праціўным выпадку будзе разглядацца, як прысваеньне. Дырэкцыя.

ДЗЯРЖАЎНАЕ ВЫДАВЕЦТВА БЕЛАРУСІ

Паступіў у продаж НАСЬЦЕННЫ АДРЫЎНЫ КАЛЯНДАР на 1932 год.

Тыраж 250.000. Цана 15 кап.

Прадаецца ва ўсіх кнігарнях ДВБ і Райспажыўсаюзаў.

Сэктар Кнігагандлю ДВБ.

На 12-месячныя КУРСЫ тэхнікаў-прарабаў і майстароў-брыгадзіраў пры Менскім архітэктурным тэхнікуме абвяшчаецца ДАДАТКОВЫ НАБОР на аддзяленьні: 1) прарабаў па водаправоду і каналізацыі, 2) прарабаў па ацяпленьні і вэнтыляцыі. Прымаюцца рабочыя з вытворчасьці данай спэцыяльнасьці са стажам на менш 1 году, з адукацыяй за 7-годку. Агульны прыём на курсы вызначан у 60 асоб да 1-5. Прыём заяў працягнут да 30 сьнежня 1931 г. Анкеты і даведкі атрымаць у канцылярыі тэхнікуму (вул. К. Маркса, 37).

Сэктар кадраў Белптушка-кролікаводнага ТРЭСТУ абвяшчае прыём студэнтаў на 1-шы курс Трудаўскага птушкаводнага тэхнікуму.

У першую чаргу ў тэхнікум прымаюцца рабочыя, калгасьнікі, у другую чаргу—бядняк. Жадаючыя паступіць у тэхнікум, павінны да 25-XII-31 г. падаць на імя тэхнікуму заяву з наступнымі дакумантамі: 1) аб асьвеце (ня ніжэй 6 груп сямігодкі), 2) аб сацыяльным становішчы, 3) аб узросьце, 4) аб здароўі. Асобы, якія ня маюць дакумантаў аб асьвеце, будуць трымаць іспыты з 27 па 30 сьнежня ў наступных дысцыплінах: бел. мова, грамадазнаўства, матэматыка, фізыка. Прынятыя студэнты забясьпечваюцца стыпэндыяй і інтэрнатам, згодна палажэньня аб сельгастэхніку. Заяву з дакумантамі накіроўваць па адрасе: ст. Прэзьнь, саўгас „Труды“, Полацкага раёну, тэхнікуму.

СЭКТАР КАДРАЎ БЕЛПТУШКА-КРОЛІКАВОДНАГА ТРЭСТУ.

БАБРУЙСКІ цэрабкоп мае ў продажы парныя ТРУСАВОДНЫЯ КЛЕТКІ з рашотчатымі дзьвярамі, прыстасаваныя да ўстаноўкі ў нежылым памяшканьні. Да клетак маюцца ўсе запасныя часткі. Агледзець клеткі можна на месцы. ЗВАРАЧАЦЦА па адрасе: БССР, гор. Бабруйск. Цэрабкоп. Праўленьне БЦРК.

Даводзіцца да ведама ўсіх рабочых і служачых, што пры Менскай канторы „Саюзтранс“ з 1/1-32 г. адкрываюцца 5-месячныя КУРСЫ па падрыхтоўцы вагароў, экспэдытараў і таксіроўшчыкаў.

На курсы прымаюцца рабочыя, служачыя, іх жонкі і дзеці не маладзей 18 год. Курсанты забясьпечваюцца стыпэндыяй ад 30 да 40 р. у месяц.
Жадаючыя паступіць на курсы павінны прадставіць наступныя дакуманты: мэтрыку, даведку аб сацыяльным становішчы і пасьведчаньне аб адукацыі ня менш 4 груп сямігодкі.

Заявы прымаюцца да 28-XII-31 г. у агульнай канцылярыі Менскай канторы „Саюзтранс“ тав. Шпакам або адказным выканаўцам па кадрах тав. Троцам, па адрасе: Маскоўская, 3, кантора „Саюзтранс“.

Начальнік Менскай канторы „Саюзтранс“ КРЫЛОЎ.

ПЫТАНЬНІ ПОЛУ. Палавога выхаваньня ў школе і сям'і. Альбом у трох частках (больш 1.000 малюнкаў). Пад рэдакцыяй праф. П. І. Талвава, Н. М. Іорданскага, С. Р. Вальфсона і пры ўдзеле праф. Т. П. Сахарова і праф. Н. Сярохціна. Да альбому дадаецца сем кніг (2116 стар. тэксту). Цана альбому ў папцы з усімі дадаткамі 30 р. Высылаецца толькі па атрыманьні задатку не менш 10 руб. Масква, Г. С. П. 10, Моховая ул., д. № 26, м. Масква Прасвет. с-ва „ПРОМЕТЕЙ“. Увага: Свае адрасы пішыце на купонах даклдна і ясна.

Даводзіцца да ведама ўсіх грамадзян, што БЕЛГАНДАЛЬ праводзіць пакупку старых гумовых вырабаў па цэнах Наркамснабу (стар. галёш, гумовых боцікаў і г. д.) уг. Менску, магаз. № 13, Козьма-Дзям'янаўская, рог пл. Волі, пляц Парыжскай Камуны, закрыты размеркавальнік № 2 (толькі ад прымацаваных да гэтага магазыну). Водпуск новых галёш будзе праводзіцца па здачы старых асоб пры падачы квітка аб здачы. Здатчыкам прадастаўляецца ільгота. Белгандаль.

Кошт публікацыі аб згубе дакум. 1 руб.

Для распаўсюджваньня выданьняў Беларускай Акадэміі Навук ПАТРЭБЕН супрацоўнік, які ведае кніжную справу. Аплата працы па згодзе. Заявы накіроўваць у БАН.

Беларускае аддзяленьне Кнігацэнтру „ОГИЗ РСФСР“

АДКРЫЎСЯ АДДЗЕЛ „КНІГА-СПАЖЫЎЦУ“.

Пры заказе усялякая кніга, якая ёсьць на кніжным рынку, у аднадзенны тэрмін будзе выслана накладной платай.

ЗАКАЗЫ НАКІРОЎВАЦЬ ПА АДРАСЕ: МЕНСК, „КНІГА-СПАЖЫЎЦУ“.

Менск, друкарня г. «ЗЬВЯЗДА». Галоўлітбел № 337.

Лінейная калібровачная мішень LRT-BE4-V2